незалежная газета

№ 42 (688) 10 лістапада 2010

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднoўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Тэндэнцыі**

## НІП

Новая ідэалагічная палітыка і «Лістапад» як яе люстэрка. **Старонка 10.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

## Добраахвотныя памочнікі дыктатуры

Старонка 9



## Каманда геніяльнага трэнера

Старонка 15



# Колькі нам каштуе прэзідэнт? $400 мільёнаў у год!

### Кіраўніцтва справаў, Служба бяспекі, Рэзервовы фонд...

Афіцыйныя даходы кіраўніка дзяржавы стануць вядомыя беларусам, як толькі будуць апублікаваныя дэкларацыі аб даходах кандыдатаў у прэзідэнты. Апошні раз такая інфармацыя была ў 2005 годзе. Тады кіраўнік дзяржавы зарабіў за год 59 мільёнаў рублёў. У эквіваленце гэта складала каля 20 тысяч еўра.

Але выдаткі краіны на прэзідэнта — гэта не толькі ягоны афіцыйны заробак. Абслугоўванне прэзідэнта вымагае шмат дадатковых стратаў, і некаторыя з іх прапісваюцца ў бюджэце. Якія менавіта?

Першым радком у раздзеле «Агульнадзяржаўная дзейнасць» бюджэту краіны ідуць выдаткі на «дзяржаўныя органы, якія забяспечваюць дзейнасць прэзідэнта». З года ў год гэтая лічба вагаецца ў раёне $12 мільёнаў. Выключэннем-рэкардсменам стане толькі наступны год. Дзейнасць прэзідэнта «падаражае» ажно на 37% у параўнанні з леташнім паказчыкам. У сярэднім, усе працаздольныя беларусы вымушаны «скідвацца» па $2.

### Загадкавы фонд

Адлічэнні ў загадкавы рэзервовы фонд прэзідэнта нашмат большыя. У гэтым годзе кожны працаздольны беларус падзяліўся з кіраўніком дзяржавы зробленымі $156. Незразумелы статус грошай дае глебу для спекуляцыяй.

Вядома, што існуюць два іншыя фонды — для дапамогі юрасобам і індывідуальным прадпрымальнікам і для фінансавання расходаў, звязаных са стыхійнымі бедствамі і катастрофамі.

Што датычыць прэзідэнцкага фонду, то тут грошы ідуць на падтрымку таленавітай моладзі — выплата павышаных стыпендыяў, арганізацыя адукацыйных і забаўляльных мерапрыемстваў.

«Існаванне прэзідэнцкага фонду, які напаўняецца з бюджэту, а ягоныя грошы размяркоўваюцца прэзідэнтам, — гэта агульная практыка. Такія фонды існуюць у многіх краінах. Напрыклад, у Казахстане 300 студэнтаў атрымліваюць грошы з рук Назарбаева. Усё адно, ці будуць сродкі ісці напраcткі з бюджэту, ці выдавацца з рук прэзідэнта. Іншае пытанне, што ўсе ведаюць пра існаванне прэзідэнцкага фонду, але калі там была апошняя рэвізія і ці былі яны ўвогуле — ніхто не ведае», — кажа незалежны эканаміст Леанід Злотнікаў.

**Працяг на старонцы 4.**

# Ён быў адзін такі

На 89-м годзе жыцця памёр мастак Міхась Савіцкі.



**«З адыходам Міхася Савіцкага мы загортваем апошнюю старонку грандыёзнай эпохі. Савецкай эпохі, калі хочацца», — Рыгор Сітніца, адзін з нямногіх мастакоў, пагадзіўся сказаць развітальнае слова з нагоды смерці калегі.**
**«У яго не было сяброў. Няпросты быў чалавек», — дадае мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі. Старонка 11.**

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Выбар-2010

• **Што цвярозы думае, п'яны скажа.** Супрацоўнік Валожынскага райвыканкама трапіў пад арышт за выступ на сходзе па вылучэнні дэлегатаў на «Усебеларускі сход». **Старонка 9.**

«Калі балатаваліся паляк Шушкевіч, паляк Пазняк і паўпаляк, паўгабрэй Кебіч, я атрымаў 90% галасоў». **Старонка 5.**

**ПІНСКДРЭЎ**

## Ахвяры беларускага капіталізму

Адразу пасля пінскай трагедыі ў інтэрнэце з'явілася відэа: абгарэлы работнік выходзіць з завода, дзе толькі што адбыўся выбух. Як выявілася, мужчыну звалі Алеко Квашалі. Ён шмат гадоў працаваў на «Пінскдрэве». Апошні раз жывым яго бачылі, калі Квашалі перавозілі ў мінскі шпіталь. Ён ужо быў без прытомнасці: абгарэла не толькі цела, але і лёгкія...

Карэспандэнт «НН» сустрэўся з сям'ёй Яўгена Рапуты, які таксама загінуў на «Пінскдрэве». **Старонка 6.**

# Ксяндза Юрыя Барка адправілі ў Ізраіль

У высылку?



7 лістапада Беларусь мусіў пакінуць ксёндз Юры Барок. Апошнім часам ён служыў у Глыбокім.

Ксяндза Барка адправілі на душпастырскую працу ў Ізраіль. Такое рашэнне ўлетку прыняў віцебскі біскуп Уладзіслаў Блін.

Спачатку меркавалася, што ксёндз будзе працаваць з выхадцамі з постсавецкай прасторы. Аднак, выглядае, што ён трапіць у габрэйскую каталіцкую грамаду. Праблема заключаецца ў тым, што ні габрэйскай, ні арабскай моваў Барок не ведае.

Сам святар прызнаўся, што не хоча пакідаць Беларусь і спадзяецца ў хуткім часе вярнуцца назад на Радзіму. Брат Юрыя Вячаслаў, дарэчы, таксама святарствуе, у Расонах.

Юры Барок цікавы тым, што не баіцца выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю. Ён аспрэчвае той тэзіс, што хрысціянін не можа ўдзельнічаць у палітычным жыцці. Удзельнічаў у стварэнні Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

Такая пазіцыя выклікала незадавальненне дзяржаўных уладаў.

І вось ксяндза-беларуса выправілі прапаведаваць за Мёртвае мора.

Паводле звестак «Нашай Нівы», з высылкай ксяндза Барка ў Ізраіль супала адна пікантная гісторыя, у якой быў замешаны клірык Віцебскай дыяцэзіі, грамадзянін Польшчы. Справу тую было вырашана замяць, клірык вольна выехаў у Польшчу. І — амаль адначасова — дыяцэзія страціла «нязручнага» святара.

Нешта падобнае ўжо здаралася з айцом Андрэем Сідаровічам. Аршанскі святар удзельнічаў у Плошчы ў 2006 годзе. Быў арыштаваны пры разгоне наметавага мястэчка, атрымаў 10 сутак у Жодзінскім СІЗА. Амаль адразу пасля гэтага малады святар быў пераведзены з вялікай Оршы ў маленькую вёску Росіца, дзе няма каму прапаведаваць. Тады, паводле нашых звестак, тое адбылося таксама пасля візіту супрацоўнікаў спецслужб да каталіцкага біскупа.

**Зміцер Панкавец**

КАМЕНТАР

## Ці ведаў Купала кітайскую мову?

Адгадайце: якую моўную версію, акрамя англійскай і кітайскай, мае сайт Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы?

У Беларусі ўніверсітэты носяць імёны дзеячаў культуры, што зрабілі неацэнны ўнёсак у развіццё беларускай мовы. Але ці прысутная мова на афіцыйных сайтах тых ВНУ?

Сайт універсітэта імя Купалы мае тры моўныя версіі: англійскую, кітайскую і расейскую. Сайт педуніверсітэта імя Танка – адну расейскамоўную. (Па-беларуску адзін раздзел «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».) Па-расейску і англійску абнаўляецца старонка ўніверсітэта імя Скарыны. І толькі сайт педуніверсітэта імя Івана Шамякіна ў Мазыры мае беларускую версію.

А што ж флагманы? Сайт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта не мае беларускай версіі. Затое яе мае сайт кузні чынавенскіх кадраў: Акадэміі кіравання пры прэзідэнце. Стваральнікі старонкі Універсітэта культуры і мастацтваў дэманструюць двухмоўе: колькасць моўных версій не пазначаная, частка рубрык і раздзелаў падаецца па-беларуску, частка — па-расейску.

Калі пішуць пра нежаданне бацькоў аддаваць дзяцей у беларускія класы, часта спасылаюцца на адсутнасць беларускамоўных ВНУ. І падыход у моўным афармленні сайтаў універсітэтаў дадаткова характарызуе стан мовы ў сферы вышэйшай адукацыі. Словы Янкі Купалы, напісаныя ў далёкім 1919 годзе, застаюцца актуальнымі: «Хіба можа цёмны беларускі абывацель пажадаць беларускае школы, калі ён не ведае, ці прынясе яна яму карысць! Хіба можа ён адважыцца на бела рускую школу, калі беларушчына цэлымі сотнямі год ганьбілася і выганялася адусюль, адкуль толькі можна было?»

**Сямён Печанко**

# Генерал знайшоўся

Былы начальнік Упраўлення ўнутраных справаў Гродзенскай вобласці выйшаў са схованкі.



Знік Хацько яшчэ зімой, незадоўга да гэтага супраць яго была заведзеная крымінальная справа. Яго абвінавачвалі ў парушэнні артыкула 424 частка 3 («Злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі»).

Заяву пра знікненне зрабілі родныя міліцыянты. Хадзілі самыя розныя чуткі пра тое, куды мог дзецца Хацько. Як выявілася, хаваўся ён у Расіі, у Санкт-Пецярбургу. Праўда, сам міліцыянт падае гэта як турыстычную паездку. Ага, на дзесяць месяцаў.

Генерал прызнаўся, што злоўжываў уладай падчас будаўніцтва катэджа, а цяпер гатовы кампенсаваць нанесеную шкоду. Хацько трэба сплаціць усяго толькі 11 мільёнаў рублёў. Няўжо праз такую суму генерал кінуўся наўцёкі? Пракурор нават не выдаў ордар на арышт, а абмежаваўся хатнім арыштам.

У Хацько была вялізная ўлада ў Гродне. Гэта быў адзін з найбольш уплывовых людзей горада. Пагарэў жа ён на будаўніцтве катэджа ў Лідскім раёне.

У той час гэта быў не адзіны арышт у Гродне. Напрыклад, за кратамі апынуўся былы старшыня Гродзенскага аблсавета Аркадзь Карпуць. А незадоўга падаў у адстаўку старшыня аблвыканкама Уладзімір Саўчанка.

На час кіравання Генадзя Хацько прыпала і гучная палітычная справа — арышт ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі.

**ЗП**

## Сцісла

• **Пробная прапампоўка нафты Адэса — Броды.** 17 лістапада з адэскага порта ў Мазыр плануецца прапампаваць 80 тыс. т нафты. Пакуль гэта будзе не венесуэльская нафта.

• **Прадстаўнікі МВФ пабывалі ў Адміністрацыі Лукашэнкі.** Намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Леанід Анфімаў сустрэўся з кіраўніком місіі МВФ у Беларусі Крыстаферам Джарвісам. На сустрэчы абмяркоўваліся планы на 2011—2015 гады. Аглядная місія МВФ працуе ў Мінску да 16 лістапада.Пытанне пра новую праграму крэдытавання ў рамках працы місіі абмяркоўваць не плануецца.

• **Аб'ём продажу новых аўто дасягне дна.** За 2010 год у Беларусі будзе зарэгістравана ўсяго 10—11 тысяч новых машын. Рэкордны мінімум. Пасля падпісання Мытнага саюза стаўкі пошлінаў на ўвоз новых аўто для юрасобаў зраўнялі з расійскімі. Калі такое захаваецца, рынак новых аўтамабіляў будзе стагнаваць, а ў аб'ёме імпарту 90% будуць складаць ужываныя машыны.

• **«Аліварыя» цяпер належыць заводу Carlsberg.** Дацкі завод Carlsberg выкупіў рэшту акцый кантрольнага пакета за $6,2 млн. Цяпер яго доля ў ААТ «Піўзавод Аліварыя» складае 55,01 %. Яшчэ адным буйным акцыянерам «Аліварыі» з'яўляецца Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (21 % акцый).

• **Такі лістапад бывае раз на дзесяць гадоў.** Бліжэйшыя два тыдні будзе трымацца цёплае і вільготнае надвор'е. Тэмпература перавышае сярэднюю шматгадовую на 1—8 градусаў. Прычына — міжземнаморскія цёплыя паветраныя масы. Снег пойдзе, кажуць сіноптыкі, толькі ў канцы месяца.

• **Інваліда забілі мыліцай.** 46-гадовы жыхар вёскі Слабада (Петрыкаўскі раён) памёр у бальніцы ад мноства траўм. Днём раней 36-гадовы п'яны аднавясковец падчас сваркі мыліцай збіў інваліда. Падобнае здарэнне было ў Мазыры: 34-гадовы жыхар райцэнтра выпіваў з 57-гадовым інвалідам, а пасля да смерці збіў яго кійком.

**СМ**

### Самае чытанае на nn.by за 3 — 9 лістапада

- Трагедыя ў Пінску: чалавек з шакуючага відэа памёр у шпіталі
- Лукашэнка: Калі балатаваліся паляк Шушкевіч, паляк Пазняк і паўпаляк, паўгабрэй Кебіч, я атрымаў 90% галасоў
- Хіт Ю–Туба: Лукашэнка перакрыўлівае Ельцына, бэсціць Мядзведзева
- Снайпераў Лукашэнкі сфатаграфавалі
- Пазняк дзякуе Някляеву
- Арнэла Муці праігнаравала чырвоную дарожку «Лістапада», а Кустурыца зусім не з'явіўся
- Якая галоўная праблема ў Беларусі?
- «Марк, я люблю цябе. Алег»
- У Курапатах зламалі 36 крыжоў
- Дэнамінацыя ўжо блізкая?

### nn@nn.by

### «Галоўныя праблемы Беларусі — дурні і прэзідэнты»

Такі адказ даў адзін з апытаных на вуліцах сталіцы. Відэаапытанне можна паглядзець на сайце nn.by.


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Уладзіславу Л. з Шаркаўшчынскага раёна.
Мікалаю Т. з Асіповіцкага раёна.
Віталю Г. з Чачэрскага раёна.
Уладзіміру С. з Ашмянскага раёна.
Валянціне М. з Навагрудскага раёна.
А.А. з Пінскага раёна.
В.С. з Гомеля.
Ю.Б., Валерыю С. з Віцебска.
А.С. са Жлобінскага раёна.
Віталю П., Мікалаю Б. з Ваўкавыскага раёна.
Аркадзю К. з Івацэвіцкага раёна.

# Хацеў як лепш?

**Майстар афарызма, у Беларусі Чарнамырдзін прыклаў руку да ўмацавання аўтарытарызму.**

Былы кіраўнік урада Расеі Віктар Чарнамырдзін адышоў у Маскве ў ноч на 3 лістапада. Было яму 72 гады. Смерць напаткала яго каля 4-й раніцы. У апошні час ён моцна хварэў. Сёлета таксама памерла ягоная жонка.

Віктар Сцяпанавіч Чарнамырдзін з 1992 да 1998 узначальваў урад Расеі. З 2001 да 2009 Чарнамырдзін быў паслом Расеі ва Украіне.

Чарнамырдзін нарадзіўся 9 красавіка 1938 у вёсцы Чорны Астрог Арэнбургскай вобласці. Пачынаў працу на Орскім нафтаперапрацоўчым заводзе рабочым. У 28 гадоў скончыў Куйбышаўскі індустрыяльны інстытут па спецыяльнасці «інжынер-тэхнолаг».

У памяці людской Чарнамырдзін, безумоўна, застанецца як аматар пажартаваць і майстар афарызма.

### Чарнамырдзін паехаў у Драздзы

Для Беларусі ён, аднак, вылучыўся і тым, што ўдзельнічаў у місіі 1996 года, якая легітымізавала аўтарытарны канстытуцыйны пераварот, здзейснены Аляксандрам Лукашэнкам.

Падзеі развіваліся перад рэферэндумам 24 лістапада. Дэпутаты Вярхоўнага Савета вырашылі абвясціць імпічмент маладому прэзідэнту Лукашэнку. Але імпічмент, які збіраліся абвясціць 22 лістапада, так і не адбыўся.

За дзень да гэтага ў Мінск прыляцела група з Крамля ў складзе Віктара Чарнамырдзіна, Ягора Строева і Генадзя Селязнёва.

«Пасля прыбыцця ў Мінск расіяне падзяліліся. Чарнамырдзін паехаў да Лукашэнкі ў Драздзы, а Строеў і Селязнёў накіраваліся да дэпутатаў у Вярхоўны Савет», — узгадвае ў сваіх мемуарах былы міністр замежных справаў Пятро Краўчанка.

Праз нейкі час тагачаснаму кіраўніку Вярхоўнага Савета Сямёну Шарэцкаму пазванілі па ўрадавым нумары, запрасіўшы на перамовы ў рэзідэнцыю ў Вайсковы завулак.

Апроч расіян, у тых перамовах удзельнічалі дэпутаты Шарэцкі (цяпер у эміграцыі ў ЗША), Генадзь Карпенка (памёр) і Сяргей Калякін. Бок Лукашэнкі прадстаўлялі Міхаіл Мясніковіч (сёння — старшыня прэзідыума Акадэміі навук) і Рыгор Васілевіч (сёння — Генеральны пракурор). Быў там яшчэ тагачасны старшыня Канстытуцыйнага суда Валеры Ціхіня (адмаўляецца ад кантактаў з прэсай).

«Менавіта Чарнамырдзін прымусіў Шарэцкага і Ціхіню падпісаць «начное пагадненне», якое скасоўвала працэдуру імпічменту», — лічыць былы дэпутат Вярхоўнага савета ад БНФ Сяргей Навумчык.

«Стала зразумела, што гэты раўнд барацьбы прайграны. Расіяне нас здалі, а Шарэцкі, Карпенка, Калякін і Ціхіня не здолелі (ці не захацелі?) супрацьстаяць ціску Лукашэнкі», — напісаў Пятро Краўчанка.

А вось лідар партыі «Справядлівы свет» Сяргей Калякін кажа, што Чарнамырдзін не спрычыняўся да антыканстытуцыйнага перавароту 1996 года.

«Віктар Чарнамырдзін, як і ўся расійская дэлегацыя, ніяк не паўплываў на далейшае развіццё палітычнай сітуацыі ў краіне. Яны імкнуліся да аднаго: перажыўшы падобны канстытуцыйны крызіс у 1993 годзе, які скончыўся расстрэлам расійскага парламента і шматлікімі ахвярамі, яны хацелі, каб у Беларусі ўсё скончылася мірна», — пераканаы С.Калякін.

Праз два дні пасля тых начных падзеяў прайшоў рэферэндум, які замацаваў за Беларуссю статус прэзідэнцкай дзяржавы. Быў распушчаны Вярхоўны савет. Так пачыналася ўмацаванне аўтарытарызму ў Беларусі. Віктар Чарнамырдзін быў сярод тых, хто наўпрост паспрыяў гэтаму.

**Зміцер Панкавец**

**Афарызмы ад Чарнамырдзіна**

У памяці людской Чарнамырдзін, безумоўна, застанецца як майстар афарызма і аматар пажартаваць. Вось ягоныя выказванні, з якіх пацяшаліся людзі ў розных краінах:

«У мяне прыблізна два сыны».

«Мы з вамі так будзем жыць, што нашы дзеці і ўнукі зайздросціць стануць».

«Пасляваеце вы заўважыць прыгожых жанчын?» — «Пасляваю. Але толькі заўважыць. Нічога больш. Пра што горка шкадую».

«Прынцыпы, якія былі прынцыповыя, былі непрынцыповыя».

«Вы думаеце, што мне далёка проста. Мне далёка не проста».

«На жаль, мёртвымі душамі выглядаюць некаторыя нашы калектыўныя члены».

«Цяпер гісторыкі спрабуюць паднесці, што ў тысяча пяцьсот якімсьці годзе штосьці там было. Ды не было нічога! Усё гэта інтрыгі!»

«Чарнамырдзін тое, Чарнамырдзін сёе. Чарнамырдзін ніколі і нідзе, а заўсёды і ўсюды... І ўсім...»

«Раней паўкраіны працавала, а паўкраіны — не, а цяпер... усё наадварот».

«У харызме трэба нарадзіцца!»

«Я далёкі ад думкі...»

«Шмат гаварыць не буду, а то зноў што-небудзь скажу».

«Хацелі як лепш, а выйшла, як заўсёды».

## Сяргей Грыц: Кебіч прылажыўся да Чарнамырдзіна

**Фатограф Сяргей Грыц некалі зрабіў здымак, на якім Вячаслаў Кебіч і Віктар Чарнамырдзін зліліся ў пацалунку.**

«Гэта было ў 1994 годзе. Чарнамырдзін прыехаў на святкаванне 3 ліпеня, тады гэта адзначалася як Дзень вызвалення Мінска. Якраз гэта было за тыдзень да першых прэзідэнцкіх выбараў. У Чарнамырдзіна была вялікая праграма па горадзе. Дарэчы, тады на плошчы Перамогі ён каротка перамовіўся і з Аляксандрам Лукашэнкам. Я не магу сцвярджаць, што Кебіч і Чарнамырдзін у той вечар былі п'янымі, але што ў добрым настроі, то дакладна. Тады была нейкая гулянка на праспекце Машэрава, каля Палаца спорту. Па яе сканчэнні прэм'еры селі ў машыну. Людзі іх віталі, махалі рукамі. Спачатку машына ехала зусім ціхенька, а потым пачынала набіраць хуткасць. Але я пабег за ёй. Тады я і злавіў момант, як Кебіч прылажыўся да Чарнамырдзіна. Ніякіх праблем у мяне потым у сувязі з гэтай фоткай не было».

**Запісаў ЗП**



Культавае фота Сяргея Грыца. 1994.

## Уладзімір Асіпенка: Ёсць адчуванне, што хутка і Аўтуховіч будзе на свабодзе

Палітвязень Уладзімір Асіпенка 5 лістапада выйшаў на волю з калоніі «Ваўчыныя норы» ў Івацэвічах. Сёння былы вайсковец ужо ў Ваўкавыску. Ён быў асуджаны да трох гадоў пазбаўлення волі за перавоз і захоўванне зброі. Разам з ім былі таксама асуджаны Мікалай Аўтуховіч, Міхаіл Казлоў і Аляксандр Ларын.

**«Наша Ніва»: Як Вас вызвалялі?**

**Уладзімір Асіпенка:** Здавалася б, нічога не папярэднічала майму вызваленню. Нават адцягвалі ўмоўна-датэрміновае. Але 13 кастрычніка выклікалі на адну камісію, 20 — на іншую. 5 лістапада адбыўся суд, а праз дзве гадзіны я ўжо выходзіў з варот калоніі. Мяне сустракала ўжо дачка, якой паведамілі загадзя. А потым было ўсё: слёзы, абдымкі...

**«НН»: А як здароўе?**

**УА:** У цэлым вытрымаў, але праблемы з вачыма ёсць. Бліжэйшым часам маркую Мінск наведаць па гэтым пытанні.

**«НН»: У якіх умовах сядзелі?**

**УА:** У СІЗА ўмовы былі нашмат горшымі, чым у турме. Духата, шмат людзей губляла прытомнасць. А ў турме ўмовы былі нармальныя. У калоніі, дзе сядзеў я, ёсць новы корпус, сталоўка. Але ў цэлым, канечне, нашы турмы адсталыя і запушчаныя. Хіба што дазволілі з пакутамі тэлебачанне і тэлефонныя званкі.

**«НН»: А што за кантынгент сядзеў з Вамі?**

**УА:** Са мной сядзела ў асноўным інтэлігенцыя — чыноўнікі, прадпрымальнікі. Але людзі сядзяць абсалютна розныя: і забойцы, і гвалтаўнікі. Хачу яшчэ што сказаць: блатных парадкаў у нас не было.

**«НН»: Працягваеце лічыць сябе вінаватым?**

**УА:** Канечне, сядзелі ні за што. Сядзелі па заказу пэўнага кола людзей, якое я сабе акрэсліў. Шмат каго ўжо няма на пасадах, як, напрыклад, генерала Генадзя Хацько. Звольнілі Саўчанку. Але мноства людзей, што вялі нашу справу, працягваюць займаць пасады.

**«НН»: Вам прапаноўвалі даваць паказанні супраць Аўтуховіча?**

**УА:** Так, было такое. Казалі, што вызваляць, калі буду дапамагаць следству. Я не агаварыў чалавека, цяпер сумленне ў мяне чыстае.

**«НН»: А не бачыліся ў калоніі з Аўтуховічам?**

**УА:** Не, мы ж у розных былі. Мікалай у самых Івацэвічах, а я ў 20 кіламетрах ад горада.

**«НН»: Можа, хутка вызваляць і Аўтуховіча?**

**УА:** Ведаеце, ёсць у мяне такое пачуццё, што хутка і ён будзе на свабодзе. Дай Бог, каб так і было. Гэта абсурдна — сядзець за пяць патронаў пяць гадоў.

**Гутарыў ЗП**



Юлія Дарашкевіч

### Сціслa

• **Дырэктарам Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра прызначаны кадравы камітэтчык.** Да прызначэння Аляксандр Базанаў працаваў дарадцам у пасольстве Беларусі ў Германіі. У пачатку 2000-х ён некалькі гадоў кіраваў Цэнтрам інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ Беларусі. Менавіта ІАЦ займаецца кантролем над інтэрнэтам у нашай краіне.

• **Рашэнне ЗША аб санкцыях будзе залежаць ад прагрэсу ў сферы дэмакратыі.** Пра гэта заявіў часовы паверaны ў справах ЗША Майкл Скэнлан. «Мы чакаем, што ў Беларусі гэтыя працэсы будуць праходзіць у адпаведнасці з дэмакратычнымі нормамі. Для нас больш важна гэта, а не вынік выбараў», — сказаў амерыканскі дыпламат.

• **Еўракамісар Фюле не сустрэнецца з кандыдатамі ў прэзідэнты.** Ён прыедзе ў Беларусь 15—16 лістапада. У ліпені чыноўнік Еўрасаюза ўжо наведваў Мінск.

**ЗП**

Працяг са старонкі 1.

# Колькі нам каштуе прэзідэнт?

Дадамо, фінансаванне будоўляў, прэмій і стыпендый з прэзідэнцкага фонду актыўна выкарыстоўваецца ў прапагандзе. Так, нібы гэта не грамадства фінансуе, а асабіста палітык Аляксандр Лукашэнка.

Звычайна адлічэнні з бюджэту складаюць каля $100 мільёнаў штогод. Выключэннем стаў гэты год, калі ў выніку пераразмеркавання бюджэту выдаткі на рэзервовы фонд перавысілі $900 мільёнаў!

Нягледзячы на дэфіцыт бюджэту, кіраўнік дзяржавы вырашыў не змяншаць выдаткі на сацыяльная праграмы, даплаціўшы з «уласнай» кішэні. Вось толькі гэтыя грошы былі кампенсаваныя да канца года.

Агульная сума, што ўтрымліваецца ў рэзервовым фондзе прэзідэнта,невядомая. Па ўскосных сведчаннях, у сярэдзіне года яна складала каля $2,8 мільярда.

### Прэзідэнцкія заўхозы

Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, у адрозненне ад рэзервовага фонду, не «пазычае» грошай дзяржаўнаму бюджэту. Таму сярэднія выдаткі на гэтую ўстанову складалі за апошнюю пяцігодку «ўсяго» $90 мільёнаў.

Выхад з крызіснага 2010 года прадугледжвае, што выдаткі на імперыю прэзідэнцкіх заўхозаў узрастуць больш чым на палову — да $128 мільёнаў.

Варта адразу ўдакладніць, што прыведзеныя выдаткі ніяк не пераклікаюцца з забеспячэннем дзейнасці прэзідэнта, бо праходзяць па рознай ведамаснай класіфікацыі.

Кіраўніцтва — гэта камерцыйная структура. І няясна, чаму кожны з нас вымушаны яе так шчодра фінансаваць з уласнай кішэні.

### Бяспека даражэйшая за дзейнасць

Яшчэ некалькі установ маюць да кіраўніка краіны ўскоснае дачыненне. Яднае іх яшчэ адзін факт — усе яны ў 2011 годзе істотна падаражаюць.

Напрыклад, Акадэмія кіравання каштавала сёлета $3 мільёны, а ў наступным годзе пацягне на ўсе $3,8 мільёна.

Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце падрасце з $4,2 мільёна да $5,4 мільёна.

Трэцяя арганізацыя, Служба бяспекі прэзідэнта, замахваецца на лічбы іншага кшталту. У гэтым годзе яна каштавала амаль столькі ж, колькі «забеспячэнне дзейнасці» кіраўніка дзяржавы — $10,2 мільёна. А вось у наступным вырасце больш чым напалову — аж да $15,7 мільёна! Варта ўдакладніць, што ўсе дадзеныя за 2011 год пералічаныя па курсе 3170 рублёў.

Зробім выгляд, што верым лічбам, закладзеным у бюджэце.

**Віталь Несцераў**

**Выдаткі на дзяржаўныя органы, якія забяспечваюць дзейнасць прэзідэнта, мільярдаў рублёў** (у дужках — эквівалент у далярах)

| | |
|---|---|
| 2011 | 41,1 ($13 млн) |
| 2010 | 30 ($10 млн) |
| 2009 | 34,4 ($12 млн) |
| 2008 | 26,4 ($12 млн) |
| 2007 | 26,6 ($12 млн) |

**Адлічэнні з бюджэту ў рэзервовы прэзідэнцкі фонд, мільярдаў рублёў** (у дужках — эквівалент у далярах)

| | |
|---|---|
| 2011 | 270 ($90 млн) |
| 2010 | 2760 ($919 млн) |
| 2009 | 324 ($114 млн) |
| 2008 | 217 ($99 млн) |
| 2007 | 176 ($80 млн) |

**Адлічэнні на дзейнасць Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, мільярдаў рублёў** (у дужках — эквівалент у далярах)

| | |
|---|---|
| 2011 | 405 ($128 млн) |
| 2010 | 245 ($82 млн) |
| 2009 | 284 ($100 млн) |
| 2008 | 178 ($81 млн) |
| 2007 | 133 ($61 млн) |

# Спадар Раманчук супраць таварыша Тура

Прэтэндэнт у прэзідэнты і чыноўнік працягнулі эканамічную дыскусію падчас Мінскага форуму.

Першая спрэчка эканамістаў была завочнай і датычыла экстрэмізму.

Два тыдні таму Андрэй Тур, адказваючы на пытанні журналістаў наконт праграмы Раманчука «Мільён працоўных месцаў», заявіў, што бачыць у ёй праявы «эканамічнага экстрэмізму».

Раманчук адказаў у інтэрнэце артыкулам, у якім прывёў дзесяць прыкметаў экстрэмізму ў беларускім эканамічным курсе. Працяг спрэчкі адбыўся падчас XIII Мінскага форуму і датычыўся эфектыўнай прыватызацыі.

Раманчук заявіў, што любая прыватызацыя, праведзеная ў канкурэнтных умовах, эфектыўная. «А не тое, што выставілі на продаж пяць буйных прадпрыемстваў — і не атрымалі ніводнай прапановы, таму што пакупнікам давалі ў нагрузку 25 дадатковых умоў, — абураецца Раманчук. — Ці калі камусьці прадавалі зямлю ў цэнтры Мінска».

Кампанія, якая прыватызуе прадпрыемства, мае права рабіць з ім што заўгодна, мяркуе эканаміст.

Андрэй Тур перакананы, што трэба перастрахоўвацца: «А калі яны выкупяць прадпрыемства і спыняць вытворчасць, каб не ствараць канкурэнцыі такім самым заводам у Расіі і Украіне?» Дзяржава мусіць клапаціцца пра людзей і працоўныя месцы, мяркуе намеснік міністра эканомікі Беларусі. «Вы супярэчыце сабе, Яраслаў. Вы хочаце стварыць мільён працоўных месцаў, але не думаеце пра ўжо існуючыя» , — заявіў Андрэй Тур.

Зварот да выступоўцаў «спадар Раманчук і таварыш Тур» выклікаў прыхільныя ўсмешкі прысутных.

З ярлыка «эканамічны экстрэмізм» у дачыненні да Раманчука Андрэй Тур перайшоў на іншы, менш радыкальны — «эканамічны рамантызм».

Другое спрэчнае пытанне датычыла таго, як ставіцца да падзення Беларусі ў рэйтынгу «Вядзенне бізнэсу». Улады меркавалі, што дзяржава паднімецца з 58-ага на 48-ае месца ў свеце. Вынік аказаўся супрацьлеглы — у Беларусі агульнае 68-е месца і, у чарговы раз, апошняе ў частцы «Падаткаабкладанне».

«Калі б я быў міністрам па падатках, я б зрабіў харакіры. Калі б я быў прэм’ер-міністрам, я б успрыняў гэта як падставу для напісання заявы пра адстаўку», — заявіў Раманчук. Ён здзіўлены, што ўрад топчацца на месцы і 10 месяцаў рыхтуе дырэктыву пра лібералізацыю. На погляд Раманчука, «гэта не падыход краіны, накіраванай на мадэрнізацыю».

Абураны Тур заўважыў, што ні ў Пуціна ў Расіі, ні ў Азарава ва Украіне не ўзнікаюць такія думкі, хоць іх краіны ўваходзяць у другую сотню рэйтынга.

Задаючы адно з пытанняў, віцебскі журналіст звярнуўся да выступоўцаў «спадар Раманчук і таварыш Тур», чым выклікаў прыхільныя ўсмешкі прысутных.

Намеснік міністра эканомікі выступае за павольныя і асцярожныя рэформы ў гаспадарцы, у той час як прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта прапануе хуткі пераход на рынкавай эканомікі. Цікава, што доўгі час Тур быў сябрам АГП, але нядаўна яго выключылі з партыі.

**Яўген Васількоў**

## Еўра амаль даскочыў да 4300 рублёў

Вінаватыя амерыканцы — яны запусцілі друкарскі станок.

За апошні тыдзень еўра рэзка пайшоў угару. Расійскі рубель і даляр таксама даражэлі, але павольна. А вось еўрапейская валюта на працягу некалькіх дзён запар абнаўляла беларускія нацыянальныя рэкорды, спыніўшыся ў панядзелак на адзнацы 4291 рубель. Зразумела, што курс у абменніках яшчэ вышэйшы.

Што стала прычынай такога імклівага росту? Рэч у тым, што Федэральная рэзервовая служба ЗША заявіла, што да сярэдзіны 2011 года збіраецца выпусціць $600 мільярдаў на куплю доўгатэрміновых аблігацый. Тым самым ФРС хоча паскорыць эканамічны рост у краіне.

Праблема ў тым, што грошы бяруцца не з бюджэту, а проста дадрукоўваюцца. Гэта зніжае кошт даляра ў дачыненні да іншых валют.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Золатавалютныя рэзервы Беларусі за кастрычнік зменшыліся на $157 мільёнаў.** Міжнародныя рэзервовыя актывы краіны на 1 лістапада склалі $5828 млрд.

• **Білеты на цягнікі падаражалі на 20%.** Пры гэтым кошт праезду ў электрычках і дызелях не змяніўся.

• **Да канца 2013 года плануецца акцыянаваць усе дзяржпрадпрыемствы.** Па словах дырэктара Фонду дзяржаўнай маёмасці Наталлі Жарнасек, ужо сфармаваныя планы прыватызацыі на 2011—2013 гады.

• **Life:) страціў 300 тысяч абанентаў.** У справаздачы кампаніі Turkcell зафіксаваны адток абанентаў з беларускага Life:). Кампанія страціла 300 тысяч абанентаў. Маштабныя змены адбыліся праз новую методыку падліку абанентаў. Раней абанент лічыўся «актыўным», калі папоўніў рахунак на працягу апошніх 13 месяцаў, цяпер гэты перыяд скарочаны да паўгода. Такім чынам, у беларускага life:) налічваецца 1,2 мільёна кліентаў.

• **Азербайджанцы пабудуюць ў Мінскай вобласці фабрыку па выпуску чаю.** У Беларусь будуць прывозіць сыравіну, а тут расфасоўваць і прадаваць.

**ЯВ**



# «Хіба палітык сабе дазволіць у дачыненні да калегі падобныя рэчы?»

У Расіі зноў абурэнне.

Аляксандр Лукашэнка выказаў польскай грамадскасці свае крыўды на Дзмітрыя Мядзведзева, Уладзіміра Пуціна і распавёў пра ўзаемаадносіны з Барысам Ельцыным. Кіраўнік Беларусі сустракаўся з журналістамі польскіх СМІ. Фрагмент інтэрв'ю паказаў «Белсат».

На пытанне польскага журналіста Аляксандр Лукашэнка даў вязлівы і эмацыйны адказ, суправаджаючы фразы адпаведнымі жэстамі.

«Пасля таго што прэзідэнт Мядзведзеў пра Вас сказаў, Вы ўяўляеце сабе, як з ім далей працаваць?» — запытаўся ў яго журналіст.

— А вы ведаеце, гэта ж мяне асабіста тычылася, я ўжо пра гэта думаў. Калі б гэта [датычыла] дзяржавы, я б з ім ні разу не павітаўся. Але гэта ж мяне асабіста тычыцца, я павінен пацярпець. Я павінен цярпець, таму што гэта мяне асабіста тычыцца. І потым: Вы ведаеце, тое, што ён сказаў. Гэта ж не на шкоду мне. Гэта ж не на шкоду мне. Гэта ж ён [Мядзведзеў] паказаў, які ён палітык. Хіба палітык сабе дазволіць у дачыненні да свайго калегі падобныя рэчы? І потым: гэта хлусня, гэта няпраўда. І потым: калі мы з Вамі гаворым у прыватным парадку, абмяркоўваем пытанне, гэта катастрофа, гэта немагчыма вынесці на публічнае абмеркаванне. Хто з ім пасля гэтага будзе абмяркоўваць нейкія праблемы? Я ніколі не абмяркоўваў з Мядзведзевым — я не бачыў асабіста, але мне далі тэкст — абмяркоўваў палітыку Ельцына і Пуціна... Я гэта ў адкрытую кажу: навошта мне асабіста з ім штосьці абмяркоўваць? Я гэта адкрыта кажу: што мне няпроста было з Ельцыным, калі ён рычаў там, я не ведаю калі Вы ў Мінску тады ці, можа, у Варшаве, тады былі, калі ён роў «Шарамета адпусціце!», а Беразоўскі потым мне распавёў, як яны зладзілі гэтую правакацыю на мяжы з Літвой — ці то з Польшчай, па пераходзе праз мяжу, каб Шарамета затрымалі і на гэтым зрабіць скандал. Гэта было спраакавана. Я тады прасёк, што гэта было справакавана! Хочаце — майце! І Ельцына той жа Беразоўскі вывеў на экран, і Ельцын роў «Шарамета хай адпусцяць!», і гэтак далей [на гэтым месцы Лукашэнка зрабіў характэрны жэст, паказваючы, што Ельцын быў п'яны]. Што, мне проста было? Няпроста. Але ў яго ўнутры была любоў і павага да краіны. Ён любіў Беларусь. І калі ён ужо не стаў прэзідэнтам, ён прыехаў да мяне. Я яго прыняў вунь там — на мяжы з Польшчай у Белавежскай пушчы, мы доўга з ім сядзелі, размаўлялі, але больш Наіна Іосіфаўна [жонка Барыса Ельцына] распавядала пра яго памылкі ў дачыненні да мяне. Ён шмат пра што шкадаваў. Але мне было няпроста. Але калі ў яго ёсць нешта ўнутры, у душы — з ім можна было працаваць. А тут — любая дамоўленасць з Мядзведзевым — яна блакавалася ўрадам, нічога не вырашалася...».

Расійскае інфармацыйнае агенцтва Regnum абурана апублікавала гэтую стэнаграму ў найгалоўным.

**Мікола Бугай**

**Лукашэнка прапанаваў Кустурыцу зняць «нешта грунтоўнае»**

Аляксандр Лукашэнка, сустракаючыся ў Мінску з сербскім кінарэжысёрам Эмірам Кустурыцам, прапанаваў яму супрацоўніцтва з беларускімі кінематаграфістамі. «Калі вы захочаце зняць штосьці грунтоўнае, то мы палічым за гонар супрацоўніцтва з вамі», — цытуе кіраўніка дзяржавы БелТА.

Кустурыца прыляцеў у Мінск на сваім уласным самалёце — яго запрасілі паўдзельнічаць у працы кінафестывалю «Лістапад».

**АГ**

## Лукашэнка: Калі балатаваліся паляк Шушкевіч, паляк Пазняк і паўпаляк, паўгабрэй Кебіч, я атрымаў 90% галасоў

Гутарка польскіх журналістаў з Аляксандрам Лукашэнкам доўжылася 2,5 гадзіны. Як заўжды, нагаварона там было воз і з торбай.

Беларускія агенцтвы перадалі змест інтэрв'ю ў прычасаным выглядзе. А вось польскія СМІ цытавалі болей.

Сярод іншага, Аляксандр Лукашэнка заявіў: «У 1994 годзе, калі на пасаду прэзідэнта балатаваліся паляк Станіслаў Шушкевіч, паляк Зянок Пазняк і паўпаляк, паўгабрэй Вячаслаў Кебіч, я атрымаў 90% галасоў польскага насельніцтва». «Усе трое сцвярджаюць, што яны беларусы», — такой стрыманай рэдакцыйнай рэмаркай суправадзіла гэтую сентэнцыю газета Rzeczpospolita.

У іншым месцы Лукашэнка гаворыць ужо ў іншым тоне: «Я ва ўладу прыйшоў з апазіцыі. З тым жа Зянонам Пазняком, з тым жа Шушкевічам у дэмакратычным клубе былі. Мы заўсёды знаходзілі супольную мову і паважалі адзін аднаго. Але на першых прэзідэнцкіх выбарах нашыя шляхі разышліся».

А вось на пытанне, што б Лукашэнка рабіў, калі б атрымаў запрашэнне ўступіць у Еўрасаюз, ён адказаў: «Яно было б неадкладна разгледжанае».

**МБ**

## Вандалізм у Курапацкім лесе

Зламалі 38 крыжоў.

Выявілі тое 6 лістапада, акурат перад днём Кастрычніцкай рэвалюцыі. Як і папярэднія разы, першымі забілі трывогу грамадзяне, а міліцыя нічога не бачыла.

На думку сакратара Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ Алеся Чахольскага, бясчынства магло быць учыненае «ў гонар» 4 лістапада, якое ў Расіі святкуюць як дзень яднання расійскага народа, або Дня кастрычніцкага перавароту.

У аўторак міліцыя ўсё ж завяла крымінальную справу па першай частцы 339-га артыкула «хуліганства». На месца здарэння выязджала аператыўна-следчая група.

Як паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў Беларусі, «паваленыя крыжы былі выкладзеныя па перыметру ляснога масіву. Прычым усе — у адным кірунку, у бок лесу».

**ЗП**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Пазняк дзякуе Някляеву

за пытанне гарантый яго бяспекі.

На сустрэчы з нямецкім і польскім міністрамі замежных спраў лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў нечакана падняў тэму гарантыяў для Зянона Пазняка і Сямёна Шарэцкага. Абодва гэтыя палітыкі доўгі час вымушаныя знаходзіцца ў эміграцыі.

Але сам Пазняк у Беларусь пакуль не спяшаецца. «Спадар Някляеў сваёй нечаканай ініцыятывай паставіў Еўропу ў нязручнае становішча (уяўляю непранікнёнае маўчанне двух міністраў)», — напісаў Зянон Пазняк.

«Калі казаць сур'ёзна, то я шчыра дзякую спадару Някляеву. За 14 з паловай цяжкіх гадоў ён — першая асоба ў палітыцы, якая паставіла такое пытанне аб палітычных гарантыях майго вяртання», — кажа лідар Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ.

Зянон Пазняк з'ехаў з Беларусі ў 1996 годзе. Па яговых сцвярджаннях, існавала пагроза ягонаму жыццю, якая выходзіла з боку ўладаў. Цяпер Пазняк жыве паміж Нью-Ёркам і Варшавай. Піша кнігі і працягвае ўзначальваць партыю КХП-БНФ.

Былы старшыня Вярхоўнага Савета Сямён Шарэцкі ў 1999 годзе спачатку з'ехаў у Вільню, а ўжо адтуль перабраўся ў Штаты. Цяпер ён жыве ў Каліфорніі.

**Зміцер Панкавец**




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Шапіра не дае расслабіцца

Кіраўнік Гарадзеншчыны **Сямён Шапіра (на фота — справа, у танцы)** інспектуе рэгіён. Куды наляціць заўтра — сакрэт.

Начальнікі на ўсёй вышыні абласной вертыкалі трымаюцца ў тонусе. У некаторых раёнах высокага госця чакаюць ужо з месяц. Тым часам пачынае сыпацца наведзены на хуткую руку і апошнія грошы «парадак».

Некаторыя кіраўнікі з сумам жартуюць, што каторы тыдзень не могуць узяць чарку пасля напружанага працоўнага тыдня. «Ну, хоць «піўны» жывот трохі ападзе!» — смяецца адзін з чыноўнікаў.

**Павел Базар**

## «Марк, я люблю цябе. Алег»

Прызнаннямі ў каханні на асфальце цяжка кагосьці здзівіць. Гэта неад'емная частка гарадской культуры. Надпіс «Марк, я люблю цябе. Алег» на вуліцы Харужай выклікаў здзіўленне. Не верылася, што гэта сапраўды нехта так смела прызнаваўся ў аднаполым каханні.

«Так, гэта быў флэш-моб, — кажа прадстаўнік ініцыятывы «Гей-Беларусь» Сяргей Прадзед. — Мы з сябрамі прыдумалі зрабіць шэраг падобных надпісаў з прыдуманымі мужчынскімі і жаночымі імёнамі, каб паказаць, што ў гэтым няма нічога дрэннага».

Арганізатары спадзяюцца, што «людзі пабачаць надпісы і зразумеюць, што геі і лесбіянкі ў сваіх перажываннях такія ж, як і ўсе. Кожны мае права прызнацца ў сваіх пачуццях і не баяцца непаразумення з прычыны сваёй сэксуальнай арыентацыі».

«Вы не баіцеся, што пакрыўдзілі выпадковых Маркаў ці Алегаў, якія жывуць побач?» — запыталіся мы.

«Я добра ведаю тэорыю верагоднасці. Гэта амаль немагчыма, каб менавіта ў гэтым месцы жыў чалавек менавіта з такім імем».

**Настасся Шамрэй**

### З каментаў на nn.by

Што, быць гомасэксуалістам — гэта ўжо нармальна? Калі б я жыла ў тым раёне і мела адно з двух імён, абавязкова падала б у суд на гэтую сумнеўную арганізацыю.

**Нацыяналістка**

Кожны раз, калі паўстае тэма геяў і іх правоў, мне становіцца сорамна за сваю радзіму. Гэтыя людзі таксама маюць права на пачуцці, яны нікому не шкодзяць.

**Павел**



# Ахвяры беларускага капіталізму

**Карэспандэнт «НН» сустрэўся з сям'ёй Яўгена Рапуты, які першы загінуў падчас выбуху на «Пінскдрэве».**

Калі заязджаць у Пінск з мінскага боку, адразу ж кінецца на вочы Цэнтральны шпіталь. Цэнтральны ён, бо самы вялікі. А стаіць на ўскраіне. Сюды прывозілі пацярпелых падчас выбуху ў цэху «Пінскдрэва» 27 кастрычніка.

У тыя трагічныя дні ад жудаснага выгляду абпаленых целаў трацілі прытомнасць нават медсёстры. З тых 14-ці, каго 27 кастрычніка сюды прывезлі з «Пінскдрэва», сёння жывыя толькі трое. А двое не пабачылі і шпіталя — загінулі проста ў цэху. Сярод іх 26-гадовы Яўген Рапута.

## «Хацеў зарабіць»

Яўген быў навічком на «Пінскдрэве» — адпрацаваў тут толькі чатыры месяцы. Заробкі там былі па пінскіх мерках прывабныя — можна было нават больш за мільён зарабіць.

«Яму вельмі падабалася, калектыў быў добры, а як заробак паднялі да 750 тысяч, дык нават і слухаць не хацеў, каб мяняць месца працы, — расказвае маці Яўгена, Людміла Рапута. — Ён хацеў зарабіць. Дзіця малое, сям'я».

За чатыры дні да трагедыі ў Яўгена была магчымасць перавесціся ў іншы цэх...

Жанчына згадвае, што сын заўсёды наракаў на пыл і бруд у цэху: «Ён часам у мяне начаваў. Я калі брала праць у яго рэчы, то ўся пралка чорная была ад таго пылу».

Апошні раз Людміла Рапута бачыла сына за некалькі гадзін да трагедыі — размінулася з ім на ганку, вяртаючыся з начной змены.

«Я гэтага выбуху нават не чула, — працягвае спадарыня Людміла. — Мне знаёмы пазваніў і кажа: патэлефануй сыну. Я пазваніла, а там аўтаадказчык. Пазней мне той жа знаёмы расказаў пра выбух. Мы адразу паехалі ў бальніцу».

## Пазналі па пярсцёнку

У Цэнтральным шпіталі Пінска маці Яўгена, як і родным іншых рабочых, не далі ніякай інфармацыі. Адпраўлялі з пытаннямі ў траўмапункт.

«У шпіталі вэрхал быў. Я прасіла дактароў, каб пaглядзелі ў рэанімацыі, каб знайшлі майго сына, а яны ў адказ толькі адно: нічога не ведаем, нічога не можам сказаць», — распавядае жанчына.

Калі ж у шпіталі вывесілі спісы пацярпелых, Яўгена Рапуты там не аказалася.

Жанчыну адправілі на фабрыку, маўляў, там маюць больш поўныя спісы. Сына не было і ў тых. «Толькі доктар з хуткай мне сказаў: вы яго ўжо не знойдзеце. Вам трэба ў морг», — са слязьмі ў голасе распавядае спадарыня Людміла.

Але ў моргу цела Яўгена Рапуты таксама не было. Яго знайшлі мёртвым адразу ж пасля выбуху і пазналі па пярсцёнку. Аднак з незразумелых прычынаў пакінулі цела на тэрыторыі камбіната, дзе ён ляжаў увесь час, пакуль разбіралі завалы. Пра гэта маці расказалі супрацоўнікі морга, пашкадавалі жанчыну, хоць ім і забаронена было пра гэта гаварыць.

## Арыніч не прыйшоў

Хавалі Яўгена Рапуту ў закрытай труне. Першым. Хаўтуры дапамаглі арганізаваць гарадскія ўлады. Пахаванне наведаў кіраўнік гарвыканкама. А вось дырэктар «Пінскдрэва» Ларан Арыніч не знайшоў на гэта часу.

Пінчукі расказваюць, што ў дзень трагедыі ўласная служба аховы «Пінскдрэва» ачапіла месца выбуху разам з супрацоўнікамі мясцовага КДБ і не пускала на фабрыку нават кіраўніцтва пажарнай службы Пінска. Праз два тыдні пасля трагедыі нішто аб ёй на прахадной ужо не нагадвае. Хіба што вялікі фургон з надпісам «Медыцынская дапамога» за агароджай.

Аховы ля прахадной не было. Толькі шыкоўныя аўтамабілі кіраўніцтва. Аднак прайсці на тэрыторыю прадпрыемства, каб пабачыць, у якім стане цяпер разбураны выбухам цэх, не ўдалося. Заходзіць можна толькі работнікам прадпрыемства.

Спробы ж атрымаць каментар дырэктара «Пінскдрэва» не пасунуліся далей яго прыёмнай. Там стабільна адказваюць, што Ларана Арыніча няма на месцы. Ад моманту выбуху ён не даў ніводнага каментара прэсе.

«У іх там усё сваё. Ахова, пажарныя, нават медыкі. Вы думаеце, гэта першы такі выбух? Іх за апошнія гады некалькі было. Увесь час нешта там здаралася — людзі ж чуюць, што на фабрыцы нешта грыміць. Гранулы, ДСП — усё на экспарт ішло. Валюту атрымлівалі. Па тры змены людзі працуюць. А абсталяванне старое», — распавядае наш гід Уладзімір па дарозе да ўдавы Яўгена Рапуты, Ірыны.




**Яўген Рапута з жонкай Ірынай. Фота з сямейнага архіва.**

## «Яўген званіў за некалькі хвілін да выбуху»

«Мы пазнаёміліся з Яўгенам у шпіталі ў 2005 годзе. Я тады там была на лячэнні, а ён да свайго сябра прыходзіў. Тры з паловай гады таму, 15 красавіка 2007-га, пабраліся шлюбам», — распавядае Ірына.

Маладыя жылі ў трохпакаёўцы на ўскраіне Пінска. Нарадзіўся сын Максім. Хлопчык моцна хварэў. Яўген і Ірына марылі пераехаць у Мінск — маўляў, і ім бы там лепш было, і для сына таксама. Хацелі сваю вялікую кватэру прадаць і набыць меншую ў сталіцы. Але не паспелі.

Ірына расказвае, што Яўген вельмі не любіў працаваць па панядзелках. У гэты дзень яны прыбіралі ў цэху пыл, што назбіраўся за выходныя. Нават для гэтага спынялі вытворчасць. «Яўген мне званіў за некалькі хвілін да выбуху. Скардзіўся, што нават рэспіратары не дапамагаюць — такі пыл стаіць у цэху. Аб сваім пагаварылі, казаў, што вечарам дадому прыйдзе, адразу пасля працы...» — гаворыць Ірына.

## «Пінскдрэў» даў пачак грошай

Пасля трагічнай смерці мужа да маладой жанчыны прыходзілі і прадстаўнікі мясцовых уладаў, і з прадпрыемства. Дапамога былога начальства Яўгена Рапуты абмежавалася «пачкам грошай». Гарадскія ж чыноўнікі паводзіліся па-людску. «Хай яны ў драбязе дапамагаюць — шыбы памяняць абяцалі, абяцаюць працаўладкаванне, з лекамі для сына дапамаглі... Але гэта моцна падтрымлівае. Кіраўніцтва «Пінскдрэва» нават на пахаванні не з'вілася...» — плача жанчына.

> Як заробак паднялі да 750 тысяч, дык і слухаць не хацеў, каб мяняць месца працы.

Ірына распавядае, што на «Пінскдрэве» былі старыя выцяжкі і пыласосы, а працавалі там дзень і ноч, гонячыся за прыбыткам. Муж аб гэтым дома не расказваў, хаця не мог не ведаць аб небяспецы. Аб усім гэтым Ірына даведалася пасля выбуху ад калег Яўгена і іншых супрацоўнікаў «Пінскдрэва».

У горадзе ўсе ў курсе парадкаў, што пануюць на прадпрыемстве. Але таксама ведаюць і тое, што Ларана Арыніча паважае Лукашэнка. А таму пытанне, чаму дагэтуль ніхто з кіраўніцтва холдынга не адказаў за выбух і нават не страціў месца працы, выклікае толькі раздражненне ў пінчукоў.

Апошні пункт нашага пінскага падарожжа — могілкі. Дзевяць свежых магіл, засыпаных кветкамі і вянкамі. Першая ў шэрагу — магіла Яўгена Рапуты — кветкі на ёй ужо паспелі завянуць. Іншых пахавалі зусім нядаўна. Не ўсіх у Пінску — некаторых у навакольных вёсках, адкуль яны былі родам...

Пінск паступова забываецца пра трагедыю. Прайшлі два дні жалобы, якую абвясцілі толькі ў Брэсцкай вобласці, прайшлі пахаванні. Родныя і блізкія ахвяр прызвычайваюцца да жыцця без іх.

Гісторыя Яўгена Рапуты, які хацеў зарабіць грошай, каб забяспечыць сваёй сям'і лепшыя ўмовы жыцця, — хрэстаматыйная. Але ў ёй, як у люстэрку, адбіваецца жорсткае аблічча сучаснага беларускага капіталізму.

**Алесь Пілецкі, Пінск—Мінск**

Аўтар дзякуе Яні Палонскай за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.

## Здарэнні сцісла

• **Беларускія нявінніцы каштуюць у Стамбуле 20 тысяч даляраў.** Паліцыя Стамбула ў адной з дыскатэк арыштавала групоўку, якая прадавала цнатлівак багатым бізнесоўцам. Арыштаваныя дырэктар клуба, 8 афіцыянтаў і 18 беларусак, сярод якіх былі нявінніцы. Высветлілася, што іх прадавалі турэцкім бізнэсоўцам за 20 тыс. даляраў.

• **Расстраляў трох чалавек.** Трагедыя адбылася ў вёсцы Дамашэвічы Баранавіцкага раёна. У доме 59-гадовага мясцовага жыхара быў знойдзены труп гаспадара з агнястрэльнымі раненнем галавы, труп яго 32-гадовага аднавяскоўца з такім жа раненнем. Яшчэ адзін мясцовы жыхар, 37-гадовы мужчына, таксама з раненнем галавы змешчаны ў бальніцу. Злачынства ўчыніў 22-гадовы жыхар Баранавіч. Разам з ахвярамі ён выпіваў, а потым расстраляў іх з незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы.

• **Раскрытае забойства выкладчыка.** Труп 41-гадовага выкладчыка адной з гімназій Магілёва знайшлі на агульным балконе шматпавярховіка. Устаноўлена, што забіў яго 22-гадовы жыхар вёскі Станькава Дзяржынскага раёна, які нідзе не працуе. За суткі да забойства ён выйшаў з турмы, дзе адседжваў за крадзеж. У электрычцы пазнаёміўся з будучай ахвярай. Яны пілі на тым балконе, а пасля пасварыліся. І былы зэк некалькі разоў ударыў сабутэльніка па галаве.

• **Мазырчук абабраў царкву.** Выставіўшы аконную раму Увядзенскай царквы ў Мазыры, рабочы машынабудаўнічага завода выкраў свечкі, царкоўныя календары, нацельныя крыжыкі і грошы. Скрадзенае знайшлі, распачатая крымінальная справа.

• **Настаўніца скрала ў калегі 100 тыс.** У Пружанах па падазрэнні ў крадзяжы затрымана 51-гадовая жанчына. Яе падазраюць у тым, што выкрала ў гардэробе настаўніцкай з кішэні паліто сваёй калегі 100 тысяч рублёў.

• **Пенсіянер выклікаў міліцыю, «каб забраць выйгрыш — 450 тысяч фунтаў».** Мінчук-пенсіянер атрымаў на мабільнік СМС, дзе паведамлялася, што ён стаў уладальнікам выйгрышу ў 450 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Пенсіянер выклікаў міліцыю, каб тая... дапамагла забраць выйгрыш. У СМС, дасланай з нумара замежнага сотавага аператара, прапаноўвалася для атрымання выйгрышу патэлефанаваць на гэты нумар або зайсці на сайт і далей кіравацца інструкцыямі. Супрацоўнікі РУУС растлумачылі пенсіянеру, што, калі ён пачне выконваць прапанаваныя дзеянні, можа стаць ахвярай махляроў.

• **Два лжэміліцыянты рабавалі мінчукоў.** Крымінальную справу завяло Заводскае РУУС Мінска. Прадстаўляючыся супрацоўнікамі міліцыі, гэтыя людзі абшуквалі людзей і забіралі ў іх грошы і мабільныя тэлефоны. Вядомы, прынамсі, два такія эпізоды. Ахвярамі злачынцаў сталі 37-гадовы і 27-гадовы мінчукі.

• **Збілі, бо не так быў апрануты.** Два п'яныя бэйбусы жорстка збілі 19-гадовага хлопца, бо ім не спадабалася, як ён быў апрануты. Аднаго з хуліганаў злавілі, другога шукаюць. Ім пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

• **Не спадабалася, як робіць шашлык — атрымаў у адказ шампурам.** 27-гадовая мінчанка з сябрам адпачывала ў лесапарку ля Мінска. Падпітаму прыяцелю не спадабалася, як яна нанізвае мяса для шашлыку, ён стаў крычаць, развярнуў нагой мангал, мяса пападала на зямлю. У адказ герой атрымаў шампурам у грудзі. Ён выжыў, сяброўка можа атрымаць восем гадоў турмы.

**СМ**

**Сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Кастрычніцкага раёна Мінска запрашае на працу прыёмным бацькам (маці).**

Узрост дзяцей у прытулку, якія маюць сіроцкі статус, ад 3–х да 15–ці год. Дзіця будзе пражываць у Вашай сям'і.

Прыблізная заработная плата — 600 000 руб., падтрымка на дзіця — 300 000 руб. Поўны сацыяльны пакет.

З прыёмнымі бацькамі заключаецца працоўная дамова, на падставе якой налічваецца стаж, аплочаны адпачынак.

Патрабаванні да кандыдатаў: узрост ад 18 да 55 год, наяўнасць медычнага заключэння і жылога памяшкання, адсутнасць судзімасцяў, псіхолага–педагагічная падрыхтаванасць.

**Наш адрас:** г. Мінск, вул. Варанянскага, д. 11, корп. 6, тэл. (017) 222–76–26, (017) 222–82–35.

# Беларускі прарыў на нямецкім фронце

**На захад ад Одэра пашыраецца кола зацікаўленых беларускай культурай.**

Семдзесят з гакам тысяч словаў ды выразаў, цвёрдая вокладка, афарбаваная ў колеры нямецкага сцяга, — такі ён, вялікі беларуска-нямецкі слоўнік, які быў прэзентаваны 4 лістапада ў Мінску. Не выданне — а сапраўдная падзея.

Зрэшты, а ці не ёсць такі слоўнік менавіта падзеяй чыста сімвалічнай? Як ні круці, а ў наш час дастаткова зайсці ў інтэрнэт-старонку аўтаматычнага перакладчыка ад Google, закінуць туды любы тэкст, націснуць кнопку — і (цалкам задарма) атрымаць за пару секундаў больш-менш чытэльны пераклад, хоць з беларускай на нямецкую, хоць наадварот.

Але ў тым і справа, што слоўнік такога кшталту — гэта не толькі прылада для паразумення паміж дзвюма мовамі, дзвюма культурамі, але і важны сімвал гэтага паразумення. У адрозненне ад павярхоўных інтэрнэт-сэрвісаў, ён дапамагае знайсці шлях у напластаванні сэнсаў, паказвае багацце і глыбіню моваў, разбіраецца, тлумачыць, удумваецца. І — у пэўным сэнсе — сам стварае мову, дакладней, мадэруе дыялог дзвюх моваў.

Дарэчы, нешта падобнае назіраем і ў агульным нямецка-беларускім дыскурсе.

З аднаго боку, нямецкая палітыка буйнога калібру дагэтуль ставіцца да Беларусі досыць павярхоўна, калі не сказаць інструментальна. На роўных яна размаўляе з важнымі для сваіх нацыянальных інтарэсаў гульцамі — ЗША, Кітаем, Расіяй. Беларусь з гэтай высокай палітычнай вежы не сказаць, каб была надта заўважная — ну хіба што яе кіраўнік ужо пятнаццаты год вярэдзіць, нібы тая стрэмка, увагнаная ў нафтагазавую магістраль паміж Нямеччынай ды Расіяй.

І, з іншага боку, ёсць у Нямеччыне людзі, якія ўпусцілі Беларусь у сваё сэрца — і ўжо не могуць вызваліцца з палону. Яны, як той вялікі слоўнік, не стамляюцца шукаць у Беларусі новыя сэнсы — і адкрываць іх для сваіх суайчыннікаў.

Дарэчы, калі казаць пра слоўнік, то ён не з'явіўся б без дапамогі гэтых нямецкіх сяброў Беларусі. Калі грошай на выданне не знайшлося ў нашай краіне, Інга Пэтц, нямецкі журналіст і вялікі аматар (хоць тут больш да месца было б слова «прафесіянал») Беларусі, здолеў знайсці нямецкіх сяброў і фундатараў. У выніку мы маем і вялікі беларуска-нямецкі слоўнік на 70 тысяч слоў і выразаў, і нямецка-беларускі слоўнік на 50 тысяч слоў, выдадзены ў 2006 годзе ў тым самым выдавецтве «Колас».

«У Нямеччыне, прынамсі, у Берліне, апошнім часам адбываецца сапраўды шмат мерапрыемстваў, якія датычаць Беларусі, — кажа Інга Пэтц. — У асноўным, гэта разавыя імпрэзы — канцэрты, чытанні, дыскусіі, тэатральныя выступы, фільмы і г.д. Гэта плён працы як новай беларускай дыяспары, так і маладых немцаў, якія цікавяцца Беларуссю, успрымаюць яе як самастойнае культурнае поле. У гэтым сэнсе за апошнія гады ў Нямеччыне адбыўся сапраўдны прарыў. Выгадавалася новае пакаленне немцаў, якое не заспела «халоднай вайны», але жыве ў новай Еўропе, якую жадае для сябе адкрываць. А вось пра паўнавартасны культурны абмен на афіцыйным узроўні казаць пакуль нельга. Большасць імпрэзаў — прыватныя ініцыятывы. Але ў тым, што цікавасць да беларускай культуры ў Нямеччыне будзе ўзрастаць, я не сумняваюся».

**«Мінскі форум» заснавалі не палякі, не літоўцы, а менавіта немцы.**

Слоўнік быў прэзентаваны на штогадовым Мінскім форуме — адмысловай пляцоўцы для дыялогу, якая збліжае Беларусь з Еўропай, уцягвае ў дыскусію і незалежнае грамадства, і, па магчымасці, дзяржаву. Гэта



**Маем вялікі беларуска-нямецкі слоўнік на 70 тысяч слоў.**

адзіная сталая імпрэза такога кшталту ў Беларусі — прычым запачаткавалі форум не палякі, не літоўцы, не французы, а менавіта немцы. Таксама, бадай, пра нешта гэта кажа.

«Многія папракаюць Мінскі форум, — кажа Інга Пэтц, які, акрамя ўсяго іншага, адказвае за культурную праграму форуму. — Нехта за тое, што ў ім зашмат увагі надаецца эканоміцы, іншыя за тое, што на ім не стае рэальнай крытыкі. Але форум сапраўды патрэбны. Яго трэба разглядаць як доўгатэрміновы працэс, у рамках якога штогод збіраюцца самыя розныя людзі, каб паразмаўляць, паспрачацца (а часам і патанчыць). Самыя плённыя кантакты завязваюцца не на сцэне, а па-за ёй».

Сябры Беларусі не ўзнікаюць знікадкуль — яны адгукаюцца на прыязныя жэсты з нашага боку. Як гэта адбываецца? Вось, напрыклад, тыповая схема: ініцыятыўны студэнт з Беларусі ладзіць у нямецкім універсітэце імпрэзу, скажам, паказ слайд-шоу пра нашую краіну. Падзівіцца прыходзяць тузін-два мясцовых студэнтаў. Сярод іх знойдуцца два-тры, якія вырашаць пабачыць Беларусь на свае вочы. Нехта з іх у выніку настолькі зацікавіцца краінай, што пасля вяртання вырашыць напісаць сваю магістэрскую працу на звязаную з Беларуссю тэму. Так пакрысе ён зробіцца экспертам з веданнем беларускай спецыфікі і ў перспектыве будзе ўплываць на нямецкі ўрад, партыі ці бізнэс, якія пры фармаванні сваёй беларускай стратэгіі будуць шукаць парадаў у такіх экспертаў, як ён. А пачалося ўсё са слайд-шоу!

Гэта прыклад не гіпатэтычны — па такой схеме вельмі многія немцы ўцягнуліся ў арбіту беларушчыны, і працэс гэты не спыніць, не стрымаць.

Мінскі форум — яскравы, але далёка не адзінкавы прыклад працы немцаў на карысць Беларусі. Якая безліч невялікіх, але карысных справаў робіцца ў супрацоўніцтве паміж нямецкімі і беларускімі недзяржаўнымі арганізацыямі! Ад маладзёжных абменаў да назірання за выбарамі. Не кажучы ўжо пра Чарнобыльскія ініцыятывы.

Зярняты зацікаўлення Беларуссю падаюць на ўрадлівую глебу — абы сейбіты былі. Вось, напрыклад, «Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца» аўтарства Артура Клінава. Яе нямецкі пераклад зрабіўся нечым накшталт бестселера ў зацікаўленых Беларуссю колах. Яны радасна схапіліся за яе як за ліхтарык, які хоць трохі асвятляе абрыс гэтай незразумелай Беларусі. Дарэчы, паводле некаторых звестак, раман Клінава — адна з тых кніжак, якія першымі кладуцца на стол новым амбасадарам, якія прыязджаюць у Беларусь з Нямеччыны. І, мяркуючы па ўсім, не проста кладзецца, але і з цікавасцю прачытваецца.

Дык няўжо Беларусь сапраўды цікавая немцам? «У гэтым пытанні гучыць рэха комплексу непаўнавартасці, — кажа Інга Пэтц. — Пытанне трэба ставіць інакш. Так, у цэлым Беларусь, яе культура дагэтуль невядомая ў Нямеччыне. Але яна робіцца ўсё больш вядомай. Моц — у разнастайнасці. І мы, як можам, тлумачым гэта фанабэрыстым таварышам на Захадзе, якія ў культурным плане ўсё яшчэ знаходзяцца пад уплывам «халоднай вайны» і трансатлантычнага вектара. Прыйдзе час, і ў Нямеччыне ўжо цяжка будзе знайсці чалавека, які будзе пытаца: «А што такое Беларусь?» Паверце мне, ужо я ў гэтым упэўнены! Проста для гэтага трэба добра папрацаваць і не ўпадаць у адчай».

**Алесь Кудрыцкі**

# Кікабідзэ пра расейцаў: «Не хачу такіх сяброў»

У Мінск прыляцеў ганаровы госць кінафестывалю «Лістапад» Вахтанг Кікабідзэ.

Акцёр і спявак не быў у нашай краіне ўжо сем гадоў. «Часта прыязджаў сюды ў часы «сярпа і молата». У Грузіі надта ўзрадаваліся, што я еду ў Беларусь. Мінск не пазнаў. Змяніўся ў лепшы бок, — адзначыў Кікабідзэ ў гутарцы з карэспандэнтам «НН». — Калі праводзіцца [кінафестываль] — значыцца, тут жыццё наладжваецца».

Ён упэўнены, што родная Грузія адродзіцца: «У расейцаў ёсць добрае слова — «прорвёмся».

Акцёр не ў захапленні ад сучаснага кіно. Адзначае, што італьянскае для яго ўвогуле знікла. «На тэрыторыі былога Савецкага Саюза дэградуе кінамастацтва. З'явілася шмат прыватных студый. З'яўляюцца людзі, якія лічаць, што ведаюць кіно лепш за прафесіяналаў: «Культуру транслююць фінансы. Упэўнены, што ў вас тое самае».

Кікабідзэ скардзіцца таксама, што «пісьменнікі цудоўныя ёсць, а вось сцэнарыстаў няма».

Пракаментаваў акцёр і сваю адмову прыняць ад Дзмітрыя Мядзведзева расейскі Ордэн Сяброўства ў жніўні 2008-га. «Мой бацька загінуў за гэтую [расійскую] армію пад Керчу... Я тады ехаў адпачываць у Батумі, а мне патэлефанавалі, каб вяртаўся. У гэты час, як мне хацелі ўручыць ордэн, сябры прыходзяць і страляюць. Танкі на маёй зямлі... Я сказаў, што не хачу такіх сяброў», — адзначыў Кікабідзэ. Але паведаміў, што новы сцэнарый напісаў усё-такі па-расейску.

«Палітыкі забываюць, што мы тут [на зямлі] — часова. А іх праўнукам сорамна будзе сваё прозвішча назваць», — пракаментаваў Кікабідзэ пытанне наконт дыктатуры ў Беларусі.

**Сяргей Макарэвіч**

**Вахтанг Кікабідзэ**

савецкі і грузінскі спявак, акцёр, сцэнарыст, рэжысёр. Зняўся ў фільмах «Мімíно», «ТАСС упаўнаважаны заявіць», «Каралева», «Дзюма на Каўказе», «Мужчыны і ўсе астатнія» і іншых.



Праўнукам палітыкаў сорамна будзе сваё прозвішча назваць.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Пра адзіных і Плошчу

Перамовы апазіцыі
пра адзінага кандыдата
не прыводзяць да вынікаў.

Прэс-канферэнцыя кандыдатаў у прэзідэнты 8 лістапада павінна была заклікаць людзей выйсці на вулічныя акцыі 24 лістапада і 19 снежня, але агаліла шмат іншых пытанняў падрыхтоўкі да прэзідэнцкіх выбараў.

Прыйшлі на сустрэчу з журналістамі кандыдаты Уладзімір Някляеў, Віталь Рымашэўскі, Мікалай Статкевіч, а таксама кіраўнік штаба Яраслава Раманчука Анатоль Лябедзька. Андрэй Саннікаў, Рыгор Кастусёў і Алесь Міхалевіч не прыйшлі.

### Плошча дзеля чаго?

Кандыдаты згадзіліся заклікаць людзей на вулічныя акцыі 24 лістапада і 19 снежня. Што праўда, як высветлілася, мэты ва ўсіх розныя.

Старшыня «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч кажа, што праз два тыдні на Кастрычніцкай плошчы будзе галоўным заклік Лукашэнку сыходзіць.

Уладзімір Някляеў шчыра прызнаўся, што раней акцыя планавалася як пратэст супраць нерэгістрацыі апазіцыйных кандыдатаў. Але падобна на тое, што ўлада пойдзе на рэгістрацыю ці не ўсіх прэтэндэнтаў. То дзеля чаго тады пратэставаць?

Анатоль Лябедзька ж зазначае, што гэта будзе звычайная сустрэча з выбарцамі, якая не супярэчыць выбарчаму кодэксу.

Нават у арганізатараў розняцца планы на мерапрыемства. Зрэшты, магчыма яны адно аднаму не і супярэчаць.

### Планы на 19 снежня

Заклікаюць палітыкі людзей і на акцыю ў дзень галасавання. Усе перакананыя, што лёс выбараў якраз і будзе вырашацца на вуліцы.

Часта гэтае магічнае слова «Плошча» паўтараецца журналістамі як нейкі заклён. Рэдка хто задумваецца, што ж укладаецца ў сэнс гэтага слова. Патрабаванне правядзення новых выбараў ці штурм рэзідэнцыі?

Віталь Рымашэўскі казаў пра памылкі 2006 года, што сёлета іх дапускаць нельга. А што за памылкі? «Тады быў пратэст неарганізаваны, а зараз будзе арганізаваны», — кажа В.Рымашэўскі.

Старшыня хадэкаў мае на ўвазе пад Плошчай «арганізаваны пратэст, права людзей на забастоўку».

«Нас не будуць ацэньваць па тым, што мы маглі зрабіць, але не зрабілі, а па тым, што мы зрабілі», — кажа В.Рымашэўскі.

На ягоную думку, важна, каб людзей нехта павёў за сабой. Куды павядзе мітынгоўцаў сп.Рымашэўскі? «Ёсць некалькі варыянтаў», — кажа ён.

Анатоль Лябедзька мяркуе, што задачай максімум на Плошчы ёсць перамога, задачай мінімум — пачатак перамоваў паміж уладай і апазіцыяй. Але не зусім ясна, па якіх пытаннях мусяць быць тыя перамовы.

Уладзімір Някляеў лічыць, што ўжо сёння можна гаварыць пра тое, што выбары несвабодныя і несправядлівыя. А ў такіх умовах — толькі Плошча.

### Адзіныя

Чарговы раз гаворка зайшла пра вылучэнне адзінага кандыдата. Някляеў — за, Рымашэўскі — за, Статкевіч — за. Усе лічаць, што гэта было б моцным крокам у змаганні з Лукашэнкам.

Ну вось пры журналістах усе дэкларуюць гатоўнасць, але б чаму гэтай тройцы не паказаць прыклад іншым? Не вылучыць Рымашэўскага ці Някляева ад іх? Не, гэтага не бачым, а толькі чуем бясконцыя мантры аб неабходнасці адзінага. Далей за словы пакуль не даходзіць.

І няўжо тут перашкода Андрэй Саннікаў ці Рыгор Кастусёў, якія ўдзелу ў вылучэнні адзінага не бяруць? Здаецца, што праблема ў тым, што кожны ў ролі гэтага адзінага бачыць якраз сябе.

Крытычна ў гэты бок зірнуў Анатоль Лябедзька, які не бачыць вырашэння ўсіх праблем у простым вылучэнні «адзінага». На ягоную думку, гэты момант апазіцыя ўжо страціла яшчэ паўтара года таму, а цяпер ужо позна.

Дарэчы, якраз Лябедзька і прапанаваў увесці вета на абмеркаванне гэтай тэмы пры журналістах, пакуль не будзе ніякіх вынікаў.

### Дакор аб вылучэнцах у выбаркамы

З вуснаў Лябедзькі ў бок сваіх партнёраў прагучаў яшчэ адзін дакор — адносна вылучэння прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі.

На думку старшыні АГП, з задачай на «задавальняюча» справілася толькі каманда Яраслава Раманчука (АГП вылучыла 505 сваіх прадстаўнікоў), а іншыя не зрабілі нават і гэтага.

Рымашэўскі парыраваў, што партыя іхняя незарэгістраваная, таму ім было цяжка засяроджвацца на вылучэнні. Важней было сабраць подпісы за кандыдата. Тое ж адказаў Статкевіч.

Думка ж Лябедзькі была ў тым, каб каардынаваць сваю працу хаця б тут. «Каб кожны штаб вылучыў па тысячы прадстаўнікоў, то змаглі б закрыць усе ўчасткі», — кажа А.Лябедзька.

Лябедзька кажа, што зараз самая важная барацьба за тых выбарцаў, што яшчэ не вызначыліся. Кіраўнік штаба Някляева Андрэй Дзмітрыеў працягнуў, што калі не атрымаецца заваяваць сэрцы гэтых людзей, то яны выбары проста байкатуюць.

### Сістэмная апазіцыя

Напрыканцы гаворка зайшла пра сістэмную апазіцыю. Зноў паліліся абвінавачванні ў бок некаторых палітыкаў, якія не прысутнічалі на сустрэчы, што яны гандлююцца з уладамі, каб выбіць лепшае становішча.

«Хто гэта такія?» — запыталіся мы.

«Не скажам. Гэта і так павінна быць зразумела», — сказаў В.Рымашэўскі. «Калі скажам, то нас потым у памяшканне не пусцяць», — парыраваў Лябедзька. Прэс-канферэнцыя праходзіла ў памяшканні Партыі БНФ.

Уладзімір Някляеў мяркуе, што рэзервныя грошы ў бюджэце выдзеленыя на датэрміновыя парламенцкія выбары і з’яўленне сістэмнай апазіцыі.

Прэс-канферэнцыя каторы раз засведчыла, што праблем у стане апазіцыі больш чым дастаткова, а вось часу на іх вырашэнне зусім вобмаль.

**Зміцер Панкавец**



Пофала пераконваў, Макей гіпнатызаваў.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## «Было б неразумна, каб я рэкамендаваў апазіцыі вылучыць адзінага»

Мінск цягам месяца наведаў ужо другі нямецкі міністр. Следам за Гіда Вестэрвеле прыляцеў кіраўнік ведамства канцлера ФРГ, Федэральны міністр па асаблівых даручэннях **Рональд Пофала (на фота злева)**. Па сваёй ролі гэта адпаведнік беларускаму кіраўніку Адміністрацыі прэзідэнта.

Ён далёка не першы раз у Беларусі. Нашай краінай палітык займаецца ўжо 15 гадоў. Як кажа сам Пофала, за гэты час у яго стала нямала сяброў сярод беларусаў. Міністр меў сустрэчы як з прадстаўнікамі ўлады **(Уладзімір Макей, на фота ў цэнтры)**, так і з апазіцыяй.

Пофала адзначае пэўныя зрухі падчас правядзення выбарчай кампаніі. Напрыклад, вольнае збіранне подпісаў. Але ён чакае яшчэ большых крокаў — адсутнасць перашкодаў у рэгістрацыі кандыдатаў, збалансаваны склад выбарчых камісіі, вольнае назіранне на выбарамі.«Станоўчае развіццё бачым, але нармальных прынцыпаў для свабодных выбараў няма», — зазначыў Р.Пофала.

Міністр адзначыў, што падчас сустрэчы з апазіцыяй не абмяркоўвае пытання вылучэння адзінага кандыдата. «Такія прапановы маглі б успрымацца як умяшальніцтва ва ўнутраныя справы. Свабодныя выбары — гэта неабавязкова два кандыдаты. Было б неразумна, каб я рэкамендаваў апазіцыі вылучыць адзінага», — сказаў міністр.

**ЗП**

## Апазіцыі — 0,25%

Выбарчыя камісіі, як і раней,
складаюцца са сваіх людзей.

Калі браць па партыях, то ва ўчастковыя камісіі ўключаны 54 прадстаўнікі Аб’яднанай грамадзянскай партыі (вылучаліся 505), 78 — Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» (283), 36 — Партыі БНФ (201), 10 — Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) (48), 5 — Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады (29) і ніводнага — Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ (7).

Гэта значыць, што працэнт апазіцыянераў ад агульнай колькасці складае ўсяго толькі 0,25%. Зрэшты, нават каб былі ўключаныя ўсе, то ён складаў бы толькі 1,4%.

Хаця нейкі прагрэс адзначыць можна. На мінулых выбарах апазіцыянераў было ўвогуле толькі тры чалавекі, а на мясцовых — 76.

Ірына Смяян-Семянюк з Партыі БНФ уключана ў склад участковай камісіі №104 Маскоўскага раёна сталіцы. Цікава, як яна апісвае першае пасяджэнне выбаркама.

«Выбіралі старшыню камісіі, намесніка і сакратара. Выбралі старшыню. Далей пасяджэнне пачаў весці гэты мужчына і паставіў на разгляд другое пытанне, дзе за прагаласавала 11, і ён кажа, што рашэнне прынятае аднагалосна, я кажу: «Як аднагалосна? Я не галасавала, і па правілах вы павінны запытаць хто — «за», хто — «супраць» і хто «ўстрымаўся». На гэта ён мне сказаў, што я тут ніхто і каб я закрыла рот.

Я вельмі спакойна адказала, што, згодна з выбарчым кодэксам, рашэнне прымаецца калегіяльна і што не трэба грубасцей. Аказваецца, ён думаў, што мяне будуць ў камісію прымаць яны. Я патлумачыла, што мяне ўжо прынялі і што такое рашэнне не яны прымаюць, а адміністрацыя Маскоўскага раёна, жанчына з адміністрацыі гэта пацвердзіла», — кажа І.Смяян-Семянюк.

Тым часам старшыня ЦВК паведаміла, што назіральнікам упершыню пасля 1996 года будзе дадзена магчымасць рэальна назіраць за працэсам падліку галасоў.

Раней найчасцей здаралася, што назіральнікі маглі бачыць толькі філейныя часткі сяброў камісіі. Назіральнікаў не дапускалі і блізка да стала.

Ну а хто ж тады ўвайшоў у склад камісій? Вядома, БРСМ, «Белая Русь», Саюз жанчын, прафсаюзы, Чырвоны крыж. Доля станоўчых адказаў прадстаўнікам гэтых арганізацый складае ад 93 да 99%.

**ЗП**

## Майстар ксеракопіі

Правал кандыдата Правальскага.

Большасць подпісаў, пададзеных у падтрымку вылучэння кандыдатам на пасаду прэзідэнта Уладзіміра Правальскага, прызнаныя несапраўднымі. Пра гэта паведамілі ў Першамайскай раённай выбарчай камісіі.

Прадпрымальнік Правальскі паставіў унікальны рэкорд, калі 108 са 109 тысяч подпісаў ён нібыта назбіраў на тэрыторыі Першамайскага раёна. Гэтыя лічбы адразу выклікалі недавер.

Праз нейкі час старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына паведаміла, што насамрэч Правальскі сабраў 700 подпісаў. А астатнія – гэта ксеракопіі гэтых 700.

Калі гэта так, то такога нахабства ў выбарчых кампаніях яшчэ не было. Больш у такіх аб’ёмах круцельства не назіралася. Як выявілася, якраз толькі Правальскі і не прайшоў праверкі ў выбаркамах. Іншыя дзесяць кандыдатаў адолелі 100-тысячны рубеж. Хаця, напрыклад, Рыгор Кастусёў ледзь-ледзь. У яго — 101 001 подпіс. Цяпер кандыдаты мусяць падаць у ЦВК анкеты і дэкларацыі аб прыбытку.

Рэгістрацыя адбудзецца 18 лістапада.

**ЗП**

# Што цвярозы думае, п’яны скажа

**Супрацоўнік Валожынскага райвыканкама трапіў пад арышт за выступ на сходзе па вылучэнні дэлегатаў на Усебеларускі сход.**

«Мой сын прыгожа спявае. А цяпер, мабыць, паляціць з працы», — са скрухай гаворыць Марыя Карацюк. Яе сын Віталь быў удзельнікам пасяджэння па вылучэнні дэлегатаў на Усебеларускі сход, што прайшоў у Валожынскім цэнтры культуры 27 кастрычніка. За выступ на сходзе ён адбыў 10-сутачнае пакаранне.

На сход прыйшло каля 400 чалавек. Спачатку выступалі будучыя «дэлегаты», а напрыканцы быў запланаваны канцэрт. У ім мусіў удзельнічаць 28-гадовы супрацоўнік аддзела культуры райвыканкама Віталь Карацюк.

Вось што расказвае Марыя Іванаўна. Сын быў трохі выпіўшы. Гэта нібыта заўважыў хтосьці з арганізатараў канцэрта і папрасіў хлопца сысці са сцэны. Той спусціўся ў залу. А тут кіраўнік райвыканкама пытае, ці жадае яшчэ хто з прысутных выступіць. Віталь і захацеў. Са сцэны ён раскрытыкаваў выступоўцаў, большасць з якіх былі мясцовыя чыноўнікі. Віталь сказаў, што хопіць ужо пустой балбатні, наслухаліся. Тут яму адключылі мікрафон, а потым вывелі са сцэны і адвезлі ў пастарунак.

> «Ён такі ціхі, а тут нешта павярнулася ў галаве. Ён жа талковы, усё разумее».

«Ён такі ціхі, такі спакойны, а тут нешта павярнулася ў галаве. Ён жа талковы, усё разумее», — кажа Марыя Іванаўна. Па яе словах, на выступ Віталя рэагавалі па-рознаму: «Сядзела ў зале баб’е, то крычалі, што ён малайчына, адзін праўду не пабаяўся сказаць».

З меркаваннем, што на сход Віталь Карацюк прыйшоў нецвярозы, згодныя не ўсе. «Гэта прыдумалі, каб было за што арыштаваць», — кажа паэт Алесь Пісарык. Пры гэтым ён спасылаецца на сяброў, што былі на тым сходзе. Вылучэнне дэлегатаў у Валожыне здымалі некалькі дзяржаўных тэлеканалаў.

Начальнік аддзела культуры райвыканкама Вікенцій Адамовіч адмовіўся каментаваць паводзіны свайго падначаленага. «Я нясу за яго персанальную адказнасць. Таму гэта мусіць мяне хваляваць у найпершую чаргу».

Загадчыца раённага Цэнтра культуры, дзе адбыўся сход, Марына Тур заявіла, што нічога не ведае пра здарэнне. «Што вы такое кажаце, я такога не чула! У нас усё цудоўна, усе мерапрыемствы адбываюцца на высокім узроўні. І ніякіх здарэнняў у нас не было». На пытанне, якім чынам яна нічога не ведае, калі сход адбываўся ў Цэнтры культуры, Марына Фларыянаўна заявіла: «Тое, што вы кажаце, гэта абсурд. Я вельмі спяшаюся, у мяне шмат працы — іду ў адпачынак». А потым і ўвогуле адмовілася размаўляць, паўтарыўшы, што ў іх усё цудоўна.

«НН» дазванілася да Віталя пасля вызвалення і вось як ён пракаментаваў сітуацыю: «Я сам ва ўсім вінаваты. Гэта ўсё дурная гарэлка. Да мяне прыехалі сябры і мы гэта два дні адзначалі». Віталь цвердзіць, што не памятае, пра што прамаўляў са сцэны.

**Сямён Печанко**

**«Усебеларускі сход»**

быў прыдуманы лукашэнкаўцамі ў 1996, каб легітымізаваць пераход да аўтарытарызму. Па форме нагадвае звыклыя старэйшым людзям з’езды КПСС. Дэлегатаў фармальна абіраюць, а на справе — прызначаюць па вызначаных зверху спісах. Праводзіцца з помпай, у шыкоўнай зале Палаца Рэспублікі, з багатымі падарункамі для ўдзельнікаў.

З дапамогай сходаў Лукашэнка ўзаемапавязвае чынавенства. Гэтак, аргкамітэт па правядзенні хурала–2010 узначалілі кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Макей і прэм’ер Сідорскі.

У 1996 годзе на першым сходзе прагучаў стрымана–крытычны голас кіраўніка прафсаюзаў Віктара Ганчарыка. Тады сістэма яшчэ давала збоі.

У 2006 годзе за адну спробу трапіць на Усебеларускі сход кандыдата ў прэзідэнты (!) Казуліна і ягоных даверaных асобаў жорстка збілі.

У адрозненне ад дэмакратычных, усеагульным галасаваннем абраных парламентаў, «сход» склікаецца ўладнай групоўкай.

У адрозненне ад парламента, дзе заўжды прадстаўлены розныя погляды, розныя інтарэсы, на сходзе гучыць толькі адна пазіцыя, няма дыскусіі.

«Сход» адыгрывае важную прапагандысцкую ролю. Ужо сам факт, што такі сход дазваляецца арганізаваць толькі аднаму кандыдату ў прэзідэнты — дзейнаму прэзідэнту, замацоўвае грамадства ў перакананні пра непарушнасць манаполіі Лукашэнкі на ўладу.

У мінулых хуралах брала ўдзел у тым ліку старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі — хоць яна па рангу мусіла б быць роўнааддаленаю ад усіх кандыдатаў, а таксама кіраўніцтва царквы і «грамадскіх арганізацый». Пры гэтым сход фінансуецца не са сродкаў выбарчага фонду кандыдата, а з дзяржаўнага бюджэту.

Сам факт правядзення такога «сходу» прафануе нормы дэмакратыі і перакрэслівае прынцып свабодных выбараў.

**Мікола Бугай**

**Хто прадставіць Валожыншчыну на Усебеларускім сходзе**

Як адзначаецца на сайце Валожынскага райвыканкама, 27 кастрычніка ў раённым Цэнтры культуры адбыўся сход упаўнаважаных, якія прапанавалі на чацвёрты Усебеларускі сход наступных кандыдатаў:

1. Навумовіч Уладзімір Антонавіч, 1955 г.н., вышэйшая адукацыя, старшыня Валожынскага раённага выканаўчага камітэта;
2. Сінякоў Уладзімір Яўцехавіч, 1947г.н., вышэйшая адукацыя, намеснік старшыні Сталай камісіі па праблемах Чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання парламента;
3. Крайко Валерый Пятровіч, 1954 г.н., вышэйшая адукацыя, старшыня Мінскага абласнога Суда;
4. Барушка Міхаіл Уладзіміравіч, 1966 г.н., вышэйшая адукацыя, камандзір вайсковай часці 30695;
5. Залеская Валянціна Аляксандраўна, 1962 г.н., вышэйшая адукацыя, галоўны спецыяліст аддзела адукацыі Валожынскага райвыканкама;
6. Княжэвіч Антон Эдвардавіч, 1956 г.н., сярэдняя адукацыя, кіроўца аўтобуса ДУП «Аўтамабільны парк №14»;
7. Кановіч Ганна Міхайлаўна, 1981 г.н., вышэйшая адукацыя, начальнік аддзела па справах моладзі Валожынскага райвыканкама, дэпутат Валожынскага раённага Савета дэпутатаў XXVI склікання;
8. Русакевіч Рыгор Мікалаевіч, 1946 г.н., вышэйшая адукацыя, старшыня Валожынскай раённай арганізацыі ветэранаў, ветэран вайны ў Афганістане;
9. Скрундзь Яўген Яўгенавіч, 1956 г.н., вышэйшая адукацыя, старшыня СВК «Пяршаі–2003», дэпутат Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.
10. Шчэрбітаў Пётр Паўлавіч, 1953 г.н., вышэйшая адукацыя, галоўны інжынер УП «ВоАна–Лад».

# Няправільна высунуты

**Някляеў марна спрабаваў трапіць на хурал.**

4 лістапада ў памяшканні Ліцэя БДУ адбыўся сход упаўнаважаных жыхароў Ленінскага раёна, на якім выбіралі дэлегатаў на Агульнанацыянальны сход.

У сходзе ўдзельнічалі жыхары раёна, якіх, паводле афіцыйнай версіі, папярэдне вылучалі на лакальных сходах. Узяць удзел у мерапрыемстве пажадаў і адзін з патэнцыйных кандыдатаў на пасаду прэзідэнта — Уладзімір Някляеў.

Да брамы навучальнай установы адна за адной пад’язджалі машыны і мікрааўтобусы, з якіх выходзілі пераважна жанчыны за сорак у пампезных строях ды з яшчэ больш пампезнымі прычоскамі. Былі і мужчыны. У прыватнасці, перад журналістамі чынна прадэфіляваў дырэктар Нацыянальнага музея Уладзімір Пракапцоў.

Някляева ля ганка ліцэя чакала прадстаўнічая дэлегацыя, якая складалася з членаў аргкамітэта па правядзенні сходу Ленінскага раёна ды дзясятка моцных мужчын у аднолькавай чорнай вопратцы. Дэлегацыю ўзначальваў нейкі Павел Піскуноў. Ён і заявіў Някляеву, што той не можа прысутнічаць на сходзе, бо не выканаў усіх неабходных працэдур.

«Мясцовы з’езд, на якім вас нібыта выбралі, быў праведзены не адпаведна з патрабаваннямі. У нас ёсць звесткі, што ў ім прыняло ўдзел не 302 чалавекі, як вы пішаце (неабходная колькасць — 300 чалавек), а 70—80. Таму мы не можам вас лічыць прадстаўніком Ленінскага раёна», — заявіў чыноўнік. Свайго начальніка адразу ж падтрымалі іншыя члены аргкамітэта, пераважна жанчыны:

«Няправільна высунуты, вы няправільна высунуты!» — «Мы адмовілі не толькі вам», — у адзін голас сцвярджалі жанчыны.

Някляеў пераключыў сваю ўвагу на жанчын: «Дарагія мае прыгожыя жанчыны! Чаму вы мяне не хочаце прапусціць?» Адказ быў жалезным: «Мы вас вельмі паважаем, але мы — члены аргкамітэта».

Разнастайнасць у ход падзей унёс дэпутат Генадзь Давыдзька, які акурат праціскаўся праз натоўп. «Гена, Гена, падыдзі сюды!» — загукаў Някляеў, пабачыўшы добрага знаёмага. Той ігнараваць паэта не стаў і ўвязаўся ў спрэчку.

> «Мы вас вельмі паважаем, але мы члены аргкамітэта».

«Валодзя, я не ведаю, якая тут структура, якая працэдура», — заявіў ён. «А як ты сам трапіў на сход?» — запытаў Някляеў. «Мне запрашэнне даслалі, я і прыйшоў. Так было», — адказаў дэпутат.

На пытанне журналістаў, ці праводзіўся нейкі сход па яго вылучэнні, спадар Давыдзька адказаць не змог, што выклікала вялікі шум сярод прыхільнікаў Някляева, пад які спадар дэпутат паспяшаўся ўцячы з месца падзей.

Атмасфера тым часам накалялася. Прадстаўнікі аргкамітэта, адводзячы вочы, тлумачылі Някляеву і журналістам, якім чынам спадар Давыдзька змог трапіць на сход, калі ніякіх мерапрыемстваў па вылучэнні яго кандыдатуры не праводзілася. У выніку жанчыны з аргкамітэта заявілі: «Аргкамітэт вырашае, каго запрашаць, а каго — не». Аднак крытэры выбару запрошаных асоб усё ж назваць не змаглі.

Паспрачаўшыся яшчэ хвілін пяць, Някляеў здаўся пры ўмове, што прадстаўнікі аргкамітэта возьмуць у яго тэкст заявы і агучаць яе ўдзельнікам. Спадар Піскуноў неахвотна пагадзіўся зварот узяць, аднак зачытаць яго не паабяцаў.

На гэтым і разышліся. Развітваючыся, Някляеў заявіў, што «сёння мы пабачылі, як насамрэч будуць адбывацца прэзідэнцкія выбары». Гэтай не самай аптымістычнай заявай скончылася спроба патэнцыйнага кандыдата трапіць на Усебеларускі сход.

**Алесь Пілецкі**




**Аргкамітэт ведае, хто народ, а хто — не.**

# «Зоркі», якіх не пазналі



**Новая ідэалагічная палітыка: у кампаніі дэпутатаў Янкоўскага і Давыдзькі з'явілася Арнэла Муці.**

У Мінску стартаваў Міжнародны кінафестываль «Лістапад».

У той час як Аляксандр Лукашэнка ўсё працягвае крытыкаваць айчынны кінематограф, Мінск па-ранейшаму спрабуюць зрабіць цэнтрам кінажыцця на постсавецкай прасторы і нават шырэй.

Адметнасцю сёлетняга «Лістапада» сталі запрошаныя госці — італьянская актрыса Арнэла Муці і балканскі рэжысёр Эмір Кустурыца. Наўмысна для іх упершыню была разаслана чырвоная дарожка і гучала жывая музыка (вайсковы аркестр, дзяўчаты-барабаншчыцы) на адкрыцці кінафестывалю. Але замежныя зоркі не ацанілі забаву арганізатараў. Муці праігнаравала чырвоную дарожку, а Кустурыца не з'явіўся ўвогуле на адкрыццё.

А людзі 5 лістапада, у дзень адкрыцця тоўпіліся ля Палаца Рэспублікі. Яны чакалі пабачыць вядомых артыстаў. «Зоркі», якіх нават арганізатары не ведалі ў твар, ішлі з пафасам па чырвонай дарожцы. Але людзі не маглі прывітаць іх, бо нікога проста не пазнавалі. Затое, калі з'явілася беларуская тэлежурналістка і кіраўніца ўпраўлення інфармацыі МУС Святлана Бароўская, арганізатары прывіталі яе па імені. Ды і астатніх айчынных кіношнікаў называлі пайменна. Аляксандр Яфрэмаў, Валерыя Арланава, Аляксандр Колбышаў... Эпатажная Элеанора Язерская не саступала сваёй манернасцю нават замежным гасцям.

Чыноўнікі трымаліся свайго брата. Міністр культуры Беларусі прайшоў да Палаца Рэспублікі разам з былым міністрам культуры Расеі Міхаілам Швыдковым.

Рэжысёр Андрэй Кудзіненка вырашыў прарэкламаваць свой фільм «Масакра», надзеўшы пад пінжак цішотку з лагатыпам стужкі. Строгія касцюмы, вечаровыя сукенкі. Андрэй Курэйчык вылучаўся на агульным фоне запрошаных. Беларускі сцэнарыст вырашыў не трымацца дрэс-кода і прыехаў у швэдры. Малады, але амбітны, ён пачуваўся на адкрыцці вольна, не заўважаючы «зорак» сваёй вышыні.

Старшыню лукашэнкаўскага Саюза пісьменнікаў Мікалая Чаргінца, чые кнігі экранізаваліся айчыннымі рэжысёрамі, на чырвоную дарожку не запрасілі. Ён непрыкметна прайшоў у Палац Рэспублікі, калі ўжо дарожку пачалі згортваць.

Вялікую ўвагу з боку гледачоў і журналістаў выклікаў расейскі акцёр Аляксандр Стрыжэнаў. Ён прыехаў на фестываль не з жонкай, а з эфектнай бландзінкай. Сярод іншых замежных гасцей былі Нані Брэгвадзэ, Вахтанг Кікабідзэ, Наталля Бандарчук. Але абяцаных акцёраў больш як з пяцідзесяці краінаў не было.

У межах сёлетняга кінафоруму, які працягнецца да 12 лістапада, пройдуць чатыры конкурсы: мастацкага кіно, маладога кіно, немастацкіх фільмаў, маладога немастацкага кіно, а таксама фестываль дзіцячага і падлеткавага кіно «Лістападзік». У асноўным конкурсе сярод дванаццаці карцін сёлета ўдзельнічае толькі адна беларуская — «Масакра».

**Сяргей Макарэвіч**

**Асноўны конкурсны паказ, 2010:**

**«Прагульшчыкі»** (Грузія, 2010, Ляван Когуашвілі).

**«Усходнія п'есы»** (Балгарыя–Швецыя, 2009, Камен Калеў).

**«Шчасце маё»** (Украіна–Германія–Нідэрланды, 2010, Сяргей Лазніца).

**«Святы Георгій забівае дракона»** (Сербія–Боснія–Герцагавіна–Балгарыя, 2009, Срджан Драгоевіч).

**«Выкрадальнік святла»** (Кыргызстан–Францыя–Германія–Нідэрланды, 2010, Актан Арым Кубат).

**«Зваротны рух»** (Расея, 2010, Андрэй Стэмпкоўскі).

**«Масакра»** (Беларусь, 2010, Андрэй Кудзіненка).

**«Перамір'е»** (Расея, 2010, Святлана Праскурына).

**«Рэверс»** (Польшча, 2009, Борыс Ланкош).

**«Аўрора»** (Румынія–Францыя–Швейцарыя–Германія, 2010, Хрысціна Пую).

**«Другое неба»** (Расея, 2010, Дзмітрый Мамулія).

**«Андрыена Пал»** (Венгрыя–Нідэрланды–Францыя–Аўстрыя, 2010, Агнеш Кочыш).

**Гран-пры «Золата «Лістапада» 2000—2009**

2000 — **«Рускі бунт»** (Расея)

2001 — **«Прыходзь на мяне паглядзець»** (Расея)

2002 — **«Зязюля»** (Расея)

2003 — **«Вяртанне»** (Расея)

2004 — **«Кіроўца для Веры»** (Расея)

2005 — **«Не хлебам адзіным»** (Расея–Украіна)

2006 — **«Мне не баліць»** (Расея)

2007 — **«Жыццё іншых»** (Германія)

2008 — **«Пасажырка»** (Расея)

2009 — **«Свет вялізны і выратаванне хаваецца за вуглом»** (Балгарыя–Германія–Славенія–Венгрыя).

# Два тыдні славы

Маштабная выстава да 600–годдзя Грунвальдскай бітвы.

Беларускія мастакі, як чвэрць стагоддзя таму, бяруцца за пачэсную справу разбудовы нацыянальнай гістарычнай свядомасці. Грунвальская бітва,600-годдзе якой адзначылі сёлета, займае ў беларускай свядомасці куды больш сціплае месца, чым у палякаў ці літоўцаў. Хто не ведае літоўскага брэнда «Жыльгірыс»(ад спартовых клубаў да піва з гарэлкаю), што літаральна перакладаецца з нямецкай як Грунвальд? Затое ў выяўленчым мастацтве апошніх дзесяцігоддзяў нашыя мастакі нашмат пераўзышлі калегаў з Польшчы і Літвы. Дастаткова прыгадаць палотны Гаўрылы Вашчанкі «Грунвальдская бітва», Фелікса Янушкевіча «Урокі Грунвальда», Генрыха Ціхановіча «На бітву з крыжакамі» і «Вітаўт», графічныя творы Яўгена Куліка, Міколы Купавы, Міхася Басалыгі ды багата каго яшчэ....То бок сукупны прадукт беларускай мастакоўскай дзейнасці, прысвечанай гераічнай сярэднявечнай тэматыцы, колькасна непараўнальна большы, чым у суседзяў...

Толькі летась у Палацы мастацтваў прайшла выдатная выстава да тысячагоддзя Літвы, што ўразіла маштабамі нават літоўцаў. І ўжо сёлета на Грунвальдскай выставе паказана амаль 200 твораў жывапісу, графікі і скульптуры творцаў некалькіх пакаленняў. Імпрэзу з мастакамі адкрыў гісторык Юры Бохан, распавёўшы пра саму бітву, што гэтак натхняе творцаў.

На адкрыцці можна было бачыць і высокае чынавенства, і самых што ні ёсць нацыяналістаў, прыкладам, паэта Славаміра Адамовіча. Усе адзін аднаму ўсміхаліся, ціснулі рукі. І сталі дружна, шчыра, шчыльна, як на касьбе ці на сяўбе, як пісаў Анатоль Сыс, і пад гукі старажытнае музыкі, пад звон рыцарскіх мячоў адкрылі выставу...

Апроч дыхтоўна падабранай экспазыцыі, якую складаюць творы ўсіх, бадай, відаў і жанраў матстацтва, прадстаўленых творцамі з Саюза мастакоў, перадусім, з суполкі «Пагоня», тут дэманструецца ўнікальнае сумеснае палатно беларускіх, літоўскіх і польскіх юнакоў-ліцэістаў. Гэтае палатно памерам 3,5 х 7 метраў было напісана падчас пленэра ў Польшчы паводле матываў класічнай карціны Яна Матэйкі «Грунвальдская бітва». Акрамя гэтага, выстаўленыя фотаздымкі Лявона Касабуцкага з рэканструкцыі Грунвальдскай бітвы, што ў ліпені прайшла ў Польшчы, на тых легендарных палях...

Сярод твораў, што прайшлі суровы адбор камісіі, ёсць і графіка Яўгена Шатохіна, і плакаты Уладзіміра Крукоўскага, і скульптура Геніка Лойкі ды багата каго яшчэ. Але змест выставы не абмежаваўся адно батальнымі сцэнамі ды псеўдагістарычнымі рэканстукцыямі, багата лірычных, метафарычных твораў, нават пейзажаў і нацюрмортаў. У выніку выстава выйшла эмацыйна насычанай і разнастайнай...

Выстава, прасвечаная Грунвальду, стала лагічным працягам папярэдняй выстава да тысячагоддзя Літвы. Рыцары і дудары, харугвы і мячы... А выяваў «Пагоняў» ды бел-чырвона-белых стужак нават болей... Дзякуй мастакам, дзякуй усім, хто спрычыніўся да гэтага свята беларускага духу.

**Сяргей Харэўскі**

Выставу да 600–годдзя Грунвальдскай бітвы можна пабачыць у Палацы мастацтваў (Казлова, 3) да 21 лістапада.

## Сцісла

• **Польская знаходка беларускага мастацтва.** Эцюд Бялыніцкага-Бірулі «Веснавыя воды» адшуканы ў Польшчы. Яго знайшлі сябры Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў Познані. Аднайменнае палатно з 1930 знаходзіцца ў Дзяржаўным Рускім музеі ў Санкт-Пецярбургу. На адваротным баку эцюда маецца надпіс: «Разрешено для вывоза із СССР». Рынкавы кошт твора складае прыблізна дзесяць тысяч даляраў. Сябры познаньскага таварыства зацікаўленыя, каб эцюд трапіў у Беларусь.

• **У Мінску прэзентавалі вялікі беларуска-нямецкі слоўнік.** Прэзентацыя вялікага беларуска-нямецкага слоўніка (болей за 70 тысяч словаў і выразаў) адбылася ў межах XIII Мінскага форуму. Слоўнік выйшаў накладам тысяча асобнікаў у Выдавецтве Змітра Коласа. Праца лінгвістаў над гэтым фундаментальным творам доўжылася амаль 18 год. А выйшаў ён, дзякуючы нямецкаму палітолагу Райнэру Ліндэру. Над слоўнікам працавала 17 спецыялістаў, у тым ліку з Нямеччыны.

• **Усталяваны памятны знак на месцы расстрэла ксяндза Фалькоўскага.** Памятнае месца, дзе царскія ўлады забілі і пахавалі святара, знаходзіцца зараз у гарадскім парку ў Лідзе. Напярэдадні Дня ўсіх святых на гэтым месцы быў усталяваны памятны камень, які вырабіў мясцовы скульптар Рычард Груша і асвяціў пробашч Фарнага касцёла Уладзімір Гуляй. У імпрэзе ўзяло ўдзел каля 70 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі польскага консульства ў Гродне.

**СМ**

Працяг старонкі 1.

# Ён быў адзін такі



Чаму так сталася? Карані трэба шукаць не толькі ў асобе мастака, але ў ягоным лёсе, які неаднойчы ставіў Савіцкага на мяжу жыцця і смерці. І ў асяроддзі, у якім ён сталеў як творца і чалавек.

Салдат Міхась Савіцкі быў узяты ў палон пад Севастопалем. Ён перажыў канцлагеры Дахау і Бухенвальд. Пасля вайны быў у савецкім фільтрацыйным лагеры, некалькі гадоў служыў у Венгрыі. Потым былі Мінская мастацкая вучэльня, Інстытут імя Сурыкава ў Маскве.

Славу мастаку прынеслі цыклы твораў на тэму Другой сусветнай вайны («Гераічная Беларусь», «Лічбы на сэрцы»), Чарнобыля («Чорная быль»), серыя карцінаў на сялянскую тэматыку («Хлеб новага ўраджаю», «Хлеб», «Хлябы»). За саветамі мастак здабыў вядомасць дзякуючы сваёй лeнініяне. Але што характэрна, камуністам ён так і не стаў.

Маскоўскі перыяд, мяркуе Сяргей Харэўскі, і стаў адной з прычынаў, чаму Савіцкі быў чужым для беларускіх мастакоў. Ён першым з беларусаў стаў Народным мастаком СССР, а ў такім канкурэнтным і раўнівым да чужых поспехаў асяродку, як мастацкі, гэта дарагога каштуе.

Творы Савіцкага разбіраюць найлепшыя савецкія музеі і галерэі. Працы з рэлігійным падтэкстам вітаюцца ў Маскве і ўспрымаюцца ў штыхі на радзіме.

Міхась Савіцкі трапляе ў шэрагі савецкай мастацкай эліты. Нямногія ў савецкі час маглі пахваліцца ўласным асабняком у цэнтры Мінска.

Не стаў сваім Савіцкі і сярод мастакоў-адраджэнцаў. А мо і не спрабаваў. Хутчэй наадварот, ён свядома пайшоў на другі бок барыкадаў. У 1998 годзе ён разам са старшынёй аб'яднання «Гістарычныя веды» Адамам Залескім звярнуўся ў Генпракуратуру з просьбай прыцягнуць да крымінальнай адказнасці ўдзельнікаў навуковай канферэнцыі «Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі: 1917—1997 гады».

Злыя языкі закідаюць Савіцкаму ўдзел у рэанімацыі неасавецкай сімволікі ў 1995-м. І, нарэшце, партрэт Сталіна, напісаны ў 2002 годзе, у часы, калі ва ўладных калідорах ужо нараджалася ідэя бізнес-эксплуатацыі імя савецкага тырана. Зрэшты, той партрэт пакідае неадназначнае ўражанне. Цёмнае палатно, на якім ледзь праглядаецца абрыс фігуры Сталіна, схаванай у глыбокім цені. Не данесеная да вуснаў люлька, аб'едзены паўзмрокам твар... Апалагетыка ці здзек?

**Смерць мастака здымае ідэалагічныя рознагалоссі.**

Міхась Савіцкі быў сярод самых шанаваных сённяшняй уладай дзеячаў культуры. Можна меркаваць нават па пасмяротных знаках увагі: віцэ-прэм'ер прызначаны кіраўніком камісіі па арганізацыі пахавання, развітанне ў сталічным Доме афіцэраў, пахаванне на Алеі ганаровых грамадзянаў на Усходніх могілках. Не параўнаць з развітаннем з народным пісьменнікам Янкам Брылём, якое ўлады фактычна праігнаравалі.

Яшчэ адна супярэчнасць Савіцкага — ягоны антысемітызм. Некалі яму давялося выпраўляць карціны, прысвечаныя жахам фашысцкіх канцлагераў. У серыі «Лічбы на сэрцы» быў персанаж з зоркамі Давіда на лагерных робах. На карцінах ён паслугоўвае карнікам. Тыя зоркі мастаку давялося замаляваць. Вядома таксама, што Савіцкі прыклаў нямала намаганняў, каб не дапусціць вяртання ў Беларусь твораў Марка Шагала. Ён нярэдка адмаўляў незалежным СМІ ў інтэрв'ю, кажучы, што яны «прадаліся габрэям».

Нягледзячы на супярэчлівасць асобы, Савіцкі быў бясспрэчным лідарам савецкага мастацкага рэалізму. «У найлепшых сваіх творах ён быў праўдзівым і моцным. Савіцкі быў захавальнікам акадэмічнай школы. І ў гэтым ягоная значнасць. Ён быў адзін такі», — кажа Рыгор Сітніца.

Смерць мастака здымае ідэалагічныя рознагалоссі. Застануцца ягоныя творы. Партрэты класікаў беларускай літаратуры ўпрыгожылі школьныя падручнікі. На яго «Хлябах» узгадуецца не адно пакаленне беларусаў.

**Сямён Печанко**

**Міхаіл Савіцкі**

нар. 18.02.1922, в.Звянячы Талачынскага раёна – 8.11.2010, Мінск. Народны мастак Беларусі (1972), народны мастак СССР (1983), правадзейны член Акадэміі мастацтваў Расіі, акадэмік Нацыянальнай АН Беларусі, лаўрэат Дзяржпрэміі СССР (1973). Узнагароджаны ордэнам Скарыны, у 2006 прысвоена званне Герой Беларусі. Кіраўнік дзяржаўнай установы культуры «Творчыя акадэмічныя майстэрні жывапісу, графікі і скульптуры».



# Хлябы

«Хлябы» былі напісаныя ў 1968 годзе. Паводле сваёй кампазіцыі гэта незвычайная рэч. Сваёй траістасцю яна нагадвае будову іканастаса. Але статыка чыннага шэсця парушаецца... позіркам. Менавіта суровы позірк трэцяе жанчыны, што замыкае шэсце ў межах палатна, стаў цэнтрам кампазіцыі. Ён прачытвацца беспамылкова. Як не адразу злоўлены спакойны і дакорлівы позірк кабеты ў бажніцы, што сунімае ім чыйсьці недарэчны шэпт падчас літургіі.

Тры кабеты. Адна маладзейшая, але ў яе сцятых вуснах таксама прачытваецца незвычайнасць ды адказнасць моманту. Яны нясуць, нібы ў храм, цяжкія сялянскія хлябы сваёй уласнай работы.

Разнастайныя пералівы вохрыстых, умбрыстых пісягоў, колераў хлеба, адцененыя суровымі і графітнымі блікамі дрэваў ды цёплай сінечай спадніц. Маладзейшая кабета вылучана чыстым чырвоным абрысам хусткі... Чырвоны — колер жыцця і волі. Гэткі ж абрыс падхоплены плямаю рукавіцы, што ўпэўнена трымае бохан.

...Сялянская наіўная рэлігійнасць Савіцкага стала відавочнаю апошнімі гадамі. У «Цудзе пра хлябы» , напісаным у 1994-м, ён гатовы сказаць тое, чаго не адважваўся раней. Хрыстос, нібы падзяліўшы між людзей свой німб, адарыў кожнага круглым боханам — сімвалам святасці і неўміручасці зямлі. Для мастака — зямлі роднай...

Аднак «Хлябы», напісаныя ў недасяжна далёкім 1968-м, гэтак і засталіся непераўершанымі. «Хлябы» засталіся самым сапраўдным народным ягоным творам, што зберагаецца цяпер у Маскве.

**Паводле Сяргей Харэўскі. Сто твораў беларускага мастацтва: Міхась Савіцкі. Хлябы («Наша Ніва», 1998)**

# Усклалі кветкі, асудзілі капіталізм

7 лістапада прыхільнікі Камуністычнай партыі Беларусі сабралі ля помніка Леніну ў Мінску 70 чалавек. «Рэвалюцыя дала магчымасць кожнай дзяржаве вызначыцца. Рэвалюцыя дала магчымасць, каб да чалавека працы ставіліся з павагай. Рэвалюцыя прынесла справядлівасць, — прамаўляла падчас мітынгу Таццяна Голубева, першая сакратарка ЦК КПБ. — Мы ўзялі ўсё добрае, што было пры савецкай уладзе, і памнажаем сёння. Мы бачым, наколькі прыгожыя і чыстыя нашы гарады, народ мае магчымасць працаваць...»

Нават «правільныя» камуністы на мітынгу абураліся платнай медыцынай і адукацыяй, дарагавізнай жылля. Але свае спадзяванні камуністы звязваюць з уладай, якая кіруе пятнаццаць гадоў. «Калі Лукашэнка ўтрымаецца ва ўладзе, можа, яшчэ і будзе надзея, а калі не? Прыйдуць Шушкевіч і іншыя ды даб'юць нас», — перажывае ветэран вайны. Некаторыя ўдзельнікі акцыі жывуць у СССР літаральна. Мужчына з партрэтам Сталіна ў руках развалу СССР не прызнае і лічыць сябе яго грамадзянінам.

Пазней прыйшлі актывісты Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» (былая ПКБ пад кіраўніцтвам Сяргея Калякіна). Некаторыя прадстаўнікі КПБ прынцыпова адышлі ўбок. «Нас раз'ядналі падыходы да сённяшняй улады, — тлумачыць Зміцер Яненка, намеснік Калякіна. — Мы перакананыя, што сацыялізм немагчымы без дэмакратыі, свабоды слова і асобы. А яны лічаць, што магчыма, каб людзі зноўку жылі ў лагерах ці каб хтосьці ім дыктаваў, што нельга апранаць джынсы ці мець даўгія валасы».

Калякінцы ля помніка Леніна згадалі пра рэпрэсіі камуністычнага рэжыму. А пасля ўсклалі кветкі і пайшлі далей святкаваць чырвоны дзень календара.

Апытанне «НН» на вуліцах Мінска паказала, што беларусы забыліся, якое 7 лістапада свята. Большасць разгублена паціскала плячыма.

**Настасся Шамрэй**

# Мяне ўзялі з снарадам у руках

**Сяргей Ханжанкоў адседзеў дзесяць гадоў у лагеры за спробу ўзарваць мінскую «радыёглушылку».**

Ён — антысаветчык у трэцім пакаленні. І ўжо школьнікам ведаў, што будзе змагацца з савецкай уладай. Ён не быў беларускім нацыяналістам, бо паходзіў з Расіі. Але яго прыгнятала тое, што жыццё ўсяляк абмяжоўваецца.

Спадар Сяргей нарадзіўся ў 1942 годзе на Калыме, дзе яго бацька адбываў пакаранне. Камсамольца Мікалая Ханжанкова арыштавалі ў 1935 годзе па «кіраўскім патоку» (высылка каля ста тысяч чалавек у лагеры ў сувязі з забойствам Сяргея Кірава). Дзед па маці належаў да эсэраў. І бальшавікам супрацьстаяў да самага арышту. У 1929 годзе яго адправілі на тры гады на Салаўкі. А ў 1937-м яго зноў забралі, і больш дадому ён не вярнуўся.

«Маё дзяцінства праходзіла ў асяродку лагераў. Мне не трэба было нічога расказваць — я сам усё бачыў. У сям'і я рана пачаў прыслухоўвацца да таго, аб чым гаварылі бацькі. Гэта не было нейкім пратэстам — крытычныя адносіны да ўлады. Ад іх я засвоіў, што можа быць і другі пункт гледжання на жыццё, адрозны ад пануючага». Ён кажа, што на Калыме бачыў толькі ўсеагульны страх. Ніякіх размоў аб рэпрэсіях не чуў. Узгадвае толькі смерць Сталіна: адны плакалі, іншыя — не. Гэта для яго стала ўскосным сведчаннем неадназначных адносінаў людзей да той улады.

Да 1955-га сям'я Ханжанковых жыла ў Магадане. Як вырашылі з'язджаць адтуль, выбралі сталіцу Беларусі. «У Мінску я пайшоў у сёмы клас. У гэты час я быў сфарміраваным антысаветчыкам. Ужо ў школе я ўсіх агітаваў супраць улады». Але сярод вучняў не знаходзіў падтрымкі. «Я не бачыў таго гора, што яны бачылі ў сувязі з вайной, акупацыяй. Я не ведаў, што такое калгасная галеча (у лагеры пастаянна быў хлеб). А тутэйшыя праз гэта прайшлі. І ў іх была мэта — ухапіцца за жыццё, а не змагацца».

А Сяргей Ханжанкоў больш за ўсё хацеў змагання. Але разумеў, што для гэтага трэба арганізацыя. Паступіў у Політэхнічны інстытут, пачаў шукаць аднадумцаў. Імі сталі Віктар Храпавіцкі і Георгій Сярогін. Але сёння сп. Ханжанкоў абодвух называе выпадковымі людзьмі ў сваёй групе, хаця і не асуджае.

Ханжанкоў напісаў праграму. «Гэта была не столькі праграма, як маніфест аб нашых намерах. Агульныя дэмакратычныя патрабаванні: свабода слова, сходаў, шматпартыйнасць, прыватная ўласнасць». Спачатку думалі надрукаваць улёткі. Але палічылі гэта неэфектыўнай працай. Вырашылі правесці акцыю, якая падштурхнула б людзей да роздуму аб тым, што адбываецца вакол. Задумалі ўзарваць радыёглушылку на вуліцы Казлова ў Мінску. Яна ствapала перашкоды на пэўных хвалях, на якіх для СССР транслявaліся заходнія радыёстанцыі.

«Усе ведалі аб ёй і лічылі гэта нармальным. А чаму нармальна? Хто мае права абмяжоўваць нас у атрыманні інфармацыі?» У інстытуце сп. Сяргей атрымаў вайсковую спецыяльнасць сапёра. Таму не было праблем з тым, каб усё разлічыць. Складаней было з выбухоўкай. Але і гэтае пытанне вырашылася. «Група» Ханжанкова знайшла снарады часоў вайны і адтуль дастала тол. «З чыста практычнай падрыхтоўкай да акцыі было дрэнна. Прысутнічалі задума, жаданне... Але, напэўна, нічога не ўзарвалі б. Хутчэй за ўсё, не...», — адзначае Сяргей Ханжанкоў цяпер.

Арыштоўвалі ж антысаветчыкаў па наводцы чацвёртага члена групы, якога прынялі пазней за астатніх. Сп. Сяргей упэўнены, што той студэнт супрацоўнічаў са спецорганамі. «Накрылі» ў інтэрнацкім пакоі Віктара Храпавіцкага. Перад ад'ездам на летнюю інстытуцкую практыку вырашылі схаваць тол, шрыфты, праграму. «Мяне арыштавалі са снарадам у руках. Я ад яго яшчэ адмяжоўваўся, маўляў, знайшоў. Віктару ж адмаўляцца было немагчыма: пры сабе ён меў нашу праграму. Таму ён адразу пачаў даваць паказанні. А я толькі на наступны дзень, калі мне паказалі яго прызнанне». Гэта быў старт дзесяцігадоваму зняволенню.

У мардоўскім лагеры, куды накіравалі Ханжанкова, знаходзіліся адны палітычныя: уласаўцы, бандэраўцы, літоўскія лясныя браты, былыя паліцаі. Але ён не лічыць тыя гады страчанымі. «Гэты час быў вельмі цікавы, але толькі для тых, хто ўсур'ёз на гэта хварэў. Я цяпер шкадую, што ў мяне не хапіла часу (гэта за дзесяць гадоў!), каб пазнаёміцца з тымі, хто прайшоў вайну». Затое было знаёмства з Цімохам Вострыкавым — прадстаўніком Рады БНР, якога ў 1952 годзе закінулі ў Беларусь самалётам для арганізацыі антысавецкай барацьбы. Чалавек гэты ўразіў Ханжанкова адданасцю Беларусі.

Збіраць разам тысячы палітвязняў было небяспечна. Але сп. Ханжанкоў кажа, што «большасць гэта былі тыя, хто ні аб якім супраціве там і не марыў. Яны хацелі толькі вызваліцца. І калі кажуць, што гэта ворагі савецкай улады... нічога падобнага. Гэта былі нешчаслівыя людзі. Яны трапілі спачатку ў савецкую армію, а затым у палон, сталі паліцаямі. А да ўсяго яны па большасці былі ў лагеры на службе ў КГБ».

Вызваліцца хацелі ўсе. Але некаторыя і не забывалі аб мэце, якую ставілі перад сабой, — змаганне. Ніхто не мог думаць аб нейкім паўстанні ці нечым падобным. Адзінае, аб чым ішлі гаворкі, — каб стварыць нейкую арганізацыю пасля вызвалення. «Мы лічылі, што больш ранейшых памылак не зробім. Маўляў, створым такую арганізацыю, якую ніхто не выкрые. Але гэта былі ілюзіі. Чалавек, які трапіў у лагер, быў пад наглядам да канца жыцця».

Дзесяць гадоў прайшлі. Раней былых «палітзэкаў» не пускалі назад туды, адкуль забіралі. Але калі вызваліўся, забарону адмянілі: яна працягвала дзейнічаць толькі адносна Заходняй Украіны, Літвы, Масквы, Ленінграда. «Калі вялося следства па маёй справе, апыталі ўсіх знаёмых, кагосьці нават завербавалі. І ім было зручней, каб я вярнуўся ў Мінск». У Мінску жылі бацькі, малодшы брат, якога ўсяляк адмяжоўвалі ад любой праявы антысавецчыны. А старэйшага сына ніхто не асуджаў. Бацькі лічылі сябе вінаватымі ў тым, што адбылося.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

> Я не ведаў, што такое калгасная галеча (у лагеры пастаянна быў хлеб). А тутэйшыя праз гэта прайшлі. І ў іх была мэта — ухапіцца за жыццё, а не змагацца.

> Мы лічылі, што больш ранейшых памылак не зробім. Створым пасля вызвалення такую арганізацыю, якую ніхто не выкрые. Але гэта былі ілюзіі. Чалавек, які трапіў у лагер, быў пад наглядам да канца жыцця.

1973 год. Час брэжнеўскага застою. Што змянілася з часу пасадкі? «Знік страх у людзей. Я гаварыў усё адкрыта. Я слухаў «Голас Амерыкі» і расказваў знаёмым, калегам. І яны самі слухалі. Бо калі мяне пасадзілі, такога проста не магло быць. Але нельга сказаць, што людзі рваліся да барацьбы».

Па вяртанні Ханжанкоў знаходзіўся пад наглядам спецорганаў. Уладкаваўся на працу. Назіраўся кар'ерны рост. Праўда, падняцца вышэй пасады галоўнага інжынера забаранялі.

У 1990-м Сяргей Ханжанкоў выступіў адным з ініцыятараў правядзення з'езда былых палітзняволеных у Ленінградзе. «Спадзяваліся, што гэта будзе аснова будучай партыі. Але тут мы пралічыліся. Стварыць партыю з людзей, кожны з якіх лічыць сябе лідарам, немагчыма».

**Сяргей Макарэвіч**



СЯРГЕЙ МАКАРЭВІЧ

**Сяргей Ханжанкоў**

Нар. у 1942 у горадзе Усць–Уціны (Калыма). Арганізатар групы, што мела на мэце ўзарваць радыёглушыльную вежу ў Мінску. Дзесяць гадоў адседзеў у лагеры ў Мардовіі. Адзін з арганізатараў з'езда палітзняволеных (1990, Санкт–Пецярбург). Працаваў у праваахоўнай арганізацыі «Мемарыял» (Расія). Рэабілітацыі не прасіў. Жыве ў Мінску.

# Завулак Тамаша, які не верыў

**Кніга з серыі «Кнігарня «Наша Ніва» — раман Наталкі Бабінай «Рыбін горад» — выйшла ў перакладзе на польскую, накладам 7000 экзэмпляраў, у адным з самых буйных польскіх выдавецтваў «Рэбіс» (Познань). У падтрымку рамана выдавецтва арганізавала прома-тур. Наталка Бабіна расказвае аб сваіх уражаннях.**




Каб ляцець у Польшчу, трэба прыапрануцца — усё ж стэрэатыпы спрацоўваюць!

Апошні раз я купляла сабе нешта — торбу, боты, паліто — гадоў 8 назад. Ці мо дзесяць?

Прыходзіцца цягацца па крамах. «Купляй беларускае» — два бясконцыя дні на прымеркі. Купляю.

Падтрымліваю сілы песнямі Дзмітра і Мікалая Гнацюкоў (глядзі ю-туб).

Муж кажа, што варта прывесці ў парадак і зубы. Прыводжу. Халера, месячнага заробку як не было!

Цяпер на самалёт.

Самалёты люблю.

Углядаюся ўніз, у надзеі пабачыць Буг.

Бачу перадмесці Варшавы — акуратныя кварталікі прыгожых дамкоў, басейны, корты. Самалёт фірмы «Белавія» робіць пасадку ў аэрапорце імя Фрэдэрыка Шапэна горада Варшавы. 55 хвілін лёту.

Сустракае пан Багуслаў — «я высокі, без валасоў». Прафесійны, прыязны, дакладны. Прыехаў з Познані, дзе выйшла мая кніжка, у Варшаву, каб сустрэць мяне і арганізаваць прома-працу. Ён суправаджае мяне скрозь, ён арганізуе ўсё без найменшай накладкі. А час распісаны па хвілінах.

Таксі, заторы на варшаўскіх вуліцах. Абменьваемся звесткамі пра дзяцей і працу. Мы абодва, аказваецца, сельскія жыхары.

Гатэль «Палонія». Мармуровыя падлогі і пальмы ў кадках. Страшэнна дарагі. «Очэвісце, пані!»

Журналісты з папулярных выданняў, чалавек 10 па чарзе. Прафесіяналы неадпрэчныя. Кожны не толькі прачытаў кнігу, але ўгрызся ў яе змест. На кожнае інтэрв'ю — 30 хвілін.

## Што ў пані пад пазногцямі?

«Хто такія палешукі?»

«Ці будуць прэзідэнцкія выбары справядлівымі?»

«Як праяўляецца самаідэнтыфікацыя памежжа?»

«Цо для пані значы Буг?»

«Прошэ пані, колькі аўтабіяграфічнага ў гераіні вашай кніжцы?»

Багуслаў: «Можа, цось до піця?» Перакладчыца просіць вады.

«Які комплекс мае Беларусь як супольнасць?»

«Былэм в Мінску, там усе так багата апранутыя, а вочы пустыыыя... Чаму?»

«У бабці Макрыні пад пазногцямі была зямля — а што ў пані пад пазногцямі?» — дзяўчыну з інтэлектуальнага «Блюшча» прашу напісаць мне па мэйле — на яе пытанні трэба адказваць у спакойнай абстаноўцы, думаючы доўга.

Варшава вечарам пустая — варшавякі сядзяць па дамах, як і мінчукі. Мы ўсё-такі разам выйшлі з Расійскай імперыі.

Назаўтра — запісы на радыё. «Цось до піця?» — Перакладчыца просіць вады. — «А для пані, думаю, цёплага віскі, як пані любіць? — пытаецца вядоўца. — Дзенькуе, не тэраз!»

## Да візіту Сікорскага

Пытанні пра тое, як пані ставіцца да візіту Сікорскага.

Кажу, што не ведаю, нашто прыязджаў Сікорскі, але што вялікая частка беларускага грамадства будзе моцна расчараваная, калі акажацца, што Сікорскі прыязджаў не дабівацца справядлівых выбараў, а для нейкіх іншых мэтаў.

Сустрэча са студэнтамі, якія займаюцца на кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта. Чалавек сорак. Калі пытаю, хто чытаў Караткевіча, паднімаецца дзве-тры рукі... Ох, ох...

## У Кракаў з Барташэўскім

Сустрэча з чытачамі ў кавярні-кнігарні. Калі бачу гэтыя вочы і твары, перастаю хвалявацца. Эх! Астапа панесла! Пачынаю адчуваць сябе, як на эстрадзе, — калі на эстрадзе прынята адкрываць душу. Калі пытаюць, што варта прачытаць з сучаснай беларускай літаратуры, гавару пра кнігі Франца Сіўко і Марыі Вайцяшонак. Зноў пытаю пра Караткевіча — паднімаецца дзве-тры рукі... А вось сайт «Нашай Нівы» чыталі пад палову прысутных.

Вечар. Качка ў вельмі стылёвым рэстаране, свечка, музыка. Багуслаў: «Веш, у нас у Пазнані свая гаворка — гвара. Але знікае! Юж знікае! А така пенькна была!» Можа, таму менавіта ў Познані выдалі маю кнігу?

Едзем у Кракаў. Праз праход у вагоне — былы міністр замежных спраў, легендарны Уладзіслаў Барташэўскі, яму каля 80, ён чалавек, які прайшоў Асвенцім і сталінскія лагеры, усю дарогу візуе дакументы, правіць тэксты і сварыцца ў тэлефон наконт ордэна Белага Арла... У Польшчы дыскусія наконт уручэння яго Адаму Міхніку. Барташэўскі таксама едзе на кніжны кірмаш у Кракаў.

## І прапала Беларусь

Кракаў. Вавэль. Гатэль «Пад Вавэлем».

Зноў сустрэча са студэнтамі, на гэты раз Ягелонскага ўніверсітэта. «Ці трэба перакладаць? Ці паслухаеце беларускую мову чыстую? — пытае выкладчык. — Так, паслухаем!» — Раскрываю душу без перакладу.

Вочы Паўла — маладога ўкраінца з Нямеччыны, які вучыцца ў Кракаве.

Яна Бернатовіч, ашаламляльна прыгожая, моцная, юная, на чысцюткай беларускай мове: «Я з Беласточчыны. Я ведаю, як гэта, калі прастора цягнецца толькі на захад, а з усходу — калючы дрот. Вёску Такары падзялілі папалам, паставілі шлагбаўм — і за шлагбаўмам зарасла вуліца... Вуліца прапала... І прапала Беларусь. І я страціла маю Беларусь». Я хаваю слёзы — яны не да месца. Але яны застануцца ўва мне.

Прапаную моладзі прывезены з Беларусі пажытны хлеб, і кавалачкі імгненна разбіраюць...

У Кракаве вечарам усе на вуліцах — у кнайпах, дзе дэмакратыя і дым, і ў шыкоўных рэстаранах. Кракаў ніколі не быў у Расійскай імперыі.

## Феміністкі расплюшчаць вочы

Мая сяброўка і перакладчыца Нутрыя (яна ж Малгажата Бухалік) цягне мяне ў любімую кнайпу «Дым» у завулку Тамаша, які не верыў. Там сапраўды дым, песні, і гандлярка кветкамі прапануе закаханым парам чырвоныя і белыя ружы. «Ты феміністка! Ты феміністка, але сама пра гэта не ведаеш! Мы табе вочы расплюшчым! Мы з цябе зробім феміністку!» — даводзяць мне, перакрываючы шум, тры сімпатычныя жанчыны. Я смяюся: «Ага, як герой Мальера, які ўсё жыццё гаварыў прозай, але не ведаў пра гэта!»

Яны абмяркоўваюць новыя кнігі, новыя пераклады, новы праект перакладніцкай школы. Смяюцца і паляць.

У гатэль з кнайпы мяне праводзіць ураджэнец Пецярбурга, цвёрды каталік Мікіта Кузняцоў, рэдактар «Новой Польші», чым, як я разумею, выклікае незадавальненне сімпатычных феміністак, якія не прымаюць падобных рэчаў. Але я, дзякуючы гэтаму, не заблукала.

## Кожны бачыць сваё

Цяпер кніжны кірмаш. Падпісваю кнігі. Жанчына майго ўзросту дзякуе мне, што расказала ёй пра Беларусь.

Знаёмлюся з панам Тамашам Шпондэрам — дырэктарам выдавецтва «Рэбіс», дзе выйшла мая кніга. Углядаюся. Прыгожы, адкрыты, цвёрды твар. Мы трохі гаворым. Яго дзяды з-пад Баранавічаў.

Ведаеце, я люблю Польшчу.

Малгажата, калі выспалася пасля бурнага вечара, гаворыць: «Твой тэкст — адкрыты, і ў ім кожны бачыць сваё: памежжа, гвару, архетыпы, фемінізм, крымінал, палітыку...»

Цяпер зноў баюся: праз тыдзень — працяг прома-тура. Люблін, Беласток, Ольштын. Гэта ўжо памежжа.

Мая кніжка выйшла ў Польшчы.

Мае дзеці застануцца ў Беларусі.

А я буду памятаць той кароткі завулак Тамаша, які не верыў.

ЗБЯРЫ КНІГАРНЮ «НАША НІВА»

шукайце ў кнігарнях
і ў незалежных
распаўсюднікаў















**У Тэатры расейскага раманса (Чыгуначная, 27-2) пройдуць вечары спеўнай паэзіі «У чаканні Калядаў». 18 лістапада выступаюць Зміцер Сідаровіч і Зміцер Бартосік. 19 лістапада — Кацярына Ваданосава, Яўген Барышнікаў і гурт Alta mente. 20 лістапада — Вольга Акуліч з праграмай «Трохкутнік». 25 лістапада — Ігар Загумённаў і гурт «Скрыжалі». Пачатак а 19-й.**

## ФУТБОЛ

**Бітва «Дынамаў»**

**У суботу, 13 лістапада,** — 32 тур нацыянальнага чэмпіянату. Сустрэнуцца **«Дынама» (Мінск) і «Дынама» (Брэст). Стадыён «Дынама-Юні» ў Кунцаўшчыне. Пачатак а 14-й.** Уваход вольны.

## НЕ ПРАПУСЦІЦЕ

**Грунвальд у Мінску**

У Мінску адкрылася мастацкая выстава, прысвечаная 600-годдзю вялікай бітвы. Алей, графіка, скульптура, кераміка, фота. Дзясяткі аўтараў — дзясяткі адлюстраванняў адной гістарычнай падзеі. Георгій Паплаўскі, Гаўрыла Вашчанка, Уладзімір Басальга, Алесь Мара, Мікола Купава… Дубровенскае поле, князі і каралі ВКЛ, крыжакі ў цяжкіх латах, літоўскія ваяры, сутычкі з ворагамі. Усё гэта адлюстравана ў працах мастакоў. Выстава стала працягам леташняй, прысвечанай тысячагоддзю ад першай згадкі назвы «Літва». Выдатная выстава, выдатныя працы. **Да 21 лістапада ў Палацы мастацтва (вул. Казлова, 3).**

## КАНЦЭРТЫ

**«Нейра Дзюбель»**

**11 лістапада** гурт «Нейра-Дзюбель» прэзентуе новы альбом «Афтары праўды». Канцэрт пройдзе **ў мінскім клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29). Пачатак а 19-й.**

**Gods tower**

**20 лістапада ў «Рэактары»** зайграе легенда металічнай музыкі Беларусі — гурт Gods tower з Гомеля. **Пачатак а 19-й.**

**Madera Hard Blues**

**13 лістапада а 18-й у клубе «Графіці» (зав. Калініна, 16)** выступіць мінскі гурт Madera Hard Blues з расійскамоўнымі блюзамі.

**«Разбітае сэрца пацана»**

**14 лістапада ў «Графіці»** спявае на трасянцы група «Разбітае сэрца пацана». Плюс кардэбалет з дзвюх бойкіх дзяўчат. **Пачатак а 18-й.**

**Sciana**

**14 лістапада ў клубе «Салтайм» (пр. Незалежнасці 131/1)** выступае гурт Sciana з Брэста, пераможцы «Басовішча». **Пачатак а 18-й.**

**Ісландскі гурт Mezzoforte**

**10 лістапада а 19-й у Вялікай зале КЗ «Мінск»** — канцэрт гурта Mezzoforte. Гэта ісландскі калектыў, які грае мікс з фанка, джаз-року і ф'южн.

## ІМПРЭЗЫ

**Памяці Алеся Салаўя**

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 13) 10 лістапада а 17-й** — вечарына, прысвечаная паэту беларускай эміграцыі ХХ стагоддзя Алесю Салаўю «За цябе маё сэрца балела, дарагая мая Беларусь…». Сярод запрошаных — Міхась Скобла, Анатоль Сідарэвіч, Валянціна Трыгубовіч, Генадзь Бураўкін і інш. Успамінамі падзеліцца даўні сябар Алеся Салаўя, адзін са старэйшых нашых паэтаў Мікола Аўрамчык.

## ВЫСТАВЫ

**Барыс Забораў**

**Да 10 снежня ў Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20)** выстаўленыя 38 твораў жывапісу і скульптуры Барыса Заборава. Мастак нарадзіўся ў Мінску ў 1935-м, ад 1981 ён жыве ў Парыжы. Яго называюць беларускім мастаком, а сам Забораў лічыць сябе грамадзянінам сусвету, радзіма якога — Беларусь.

**Супраць смяротнага пакарання**

**Да 11 снежня ў Музеі гісторыі вайны (Кастрычніцкі пляц)** працуе выстава «Смерць — гэта не правасуддзе». Выстава мае на мэце паказаць, што смяротнае пакаранне мусіць быць скасаванае.

**Юдаль Пэн у Мінску**

**У Музеі Якуба Коласа (вул.Акадэмічная, 5) да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку ХХ стагоддзя.

**Скульптура з воўны**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 14 лістапада** працуе выстава «Аспекты жыцця: рэльеф і скульптура з воўны» шведскай мастачкі па тэкстылі Гуніды Пэтаў Шоберг. Гуніла Шоберг вывучала мясцовыя тэхнікі валяння лямцу ў Манголіі, Турцыі, Туркменіі, Венгрыі, а таксама ў Беларусі, дзе ўручную робіць абутак з лямцу — валёнкі.

**Ян Шматлох і вучні**

**16 лістапада а 17-й у Галерэі Акадэміі мастацтваў (вул.Сурганава, 14)** — адкрыццё выставы «Ян Шматлох і вучні». На ёй прэзентаваныя творы, выкананыя ў тэхніцы глыбокага друку. Гэтая тэхналогія, што вядзе свой радавод ад сярэднявечнай гравюры, дазваляе стварыць аб'ёмныя, рэльефныя малюнкі. У адкрыцці бярэ ўдзел прафесар Ян Шматлох, кіраўнік майстэрні глыбокага друку Катавіцкай акадэміі мастацтваў (Польшча).




## ТЭАТРЫ

**10 лістапада**

**Музычны** — «Мая жонка — ілгуння»
**Моладзевы** — «Кар'ера Чэлестына»
**Оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»
**Новы** — «Шалёныя грошы»
**Сучасны мастацкі** — «Радзіма»
**Імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «…Забыць Герастрата!»
**Беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Купалаўскі** — «Пінская шляхта»

**11 лістапада**

**Музычны** — «Шахерэзада. Іспанскія мініяцюры»
**Моладзевы** — «Калі б я меў залатыя горы…»
**Оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Новы** — «Тры пары і адзін лёс»
**Імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «…Забыць Герастрата!»
**Беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Купалаўскі** — «Пінская шляхта»

**12 лістапада**

**Лялек** — «Драй швэстэрн»
**Моладзевы** — «Вясёлы кірмаш»
**Беларускай арміі** — «Вераб'іная ноч»
**Клуб імя Дзяржынскага** — «Камедыя»
**Оперы і балета** — «Карсар»
**Новы** — «Не бойся быць шчаслівым»
**Імя Горкага** — «Эсфір»
**Беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Купалаўскі** — «Не мой»

**13 лістапада**

**Беларускай драматургіі** — «Квакі і квокі»
**Лялек** — «Чырвоны Каптурок»
**Горкага** — «Бег»
**Купалаўскі** — «Паўлінка»
**Беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»
**Оперы і балета** — «Хаваншчына»

**14 лістапада**

**Лялек** — «Кот у ботах»
**Оперы і балета** — «Чыпаліна»
**Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Купалаўскі** — «Паўлінка»
**Оперы і балета** — «Траўіята»

**15 лістапада**

**Зніч** — «Нобіль — барвяны ўладар»
**Зніч** — «Прыпадаю да нябёс….»
**Беларускай драматургіі** — «П'емонцкі звер»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Купалаўскі** — «Памінальная малітва»

**16 лістапада**

**Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Оперы і балета** — «Шчаўкунок» (Санкт-Пецярбургскі балет на лёдзе)
**Беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»
**Оперы і балета** — «Папялушка»

**17 лістапада**

**Зніч** — «Пра ката Сафрона і пеўніка Андрона»
**Купалаўскі** — «Офіс»
**Купалаўскі** — «Тэатраманія»
**Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»
**Оперы і балета** — «Папялушка»

**18 лістапада**

**Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Беларускай драматургіі** — «Жанчыны Бергмана»
**Оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»

**19 лістапада**

**Зніч** — «Пачакай, сонца!»
**Беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Лялек** — «Дом, каторы пабудаваў Свіфт»
**Горкага** — «Ідэальны муж»
**Оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

**20 лістапада**

**Лялек** — «Жахлівы пан Ау»
**Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Юнага гледача** — «Трошкі пяшчотны»
**Беларускай драматургіі** — «Яго апошняе каханне (Лета)»
**Оперы і балета** — «Баль-маскарад»

**21 лістапада**

**Лялек** — «Чароўная лямпа Аладзіна»
**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Оперы і балета** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Горкага** — «Расейскія вадэвілі»
**Беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»
**Юнага гледача** — «Трошкі пяшчотны»
**Горкага** — «Царэўна-жабка»
**Оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»

## КІНО

### Сетка для самотных

The Social Network
ЗША, 2010, каляровы, 120 хв.
**Рэжысёр:** Дэвід Фінчэр
**Ролі выконваюць:** Джэсі Айзенберг, Эндру Гарфілд, Джастын Тымберлэйк
**Жанр:** Драма
**Адзнака:** 6,5 (з 10)




Хлопец пасварыўся з дзяўчынай. Напісаў пра гэта ў сваім блогу — дый стварыў сацыяльную сетку, дзе людзі віртуальна камунікуюць. Але ці заменіць гэта жыццё?

«Сацыяльная сетка» — драма Дэвіда Фінчэра пра самага маладога мільярдэра Марка Цукерберга, які стварыў папулярную сетку Facebook. Гісторыя пабудаваная як займальны дэтэктыў. Два судовыя працэсы, развязаныя супраць Цукерберга пакрыўджанымі сябрамі, ягоныя ўспаміны, сведчанні юрыстаў.

Фінчэр паказвае механіку сучаснага бізнэсу. Гэта механіка амбітных творчых суполак, над якімі няма ніякай улады. Маторчык суполкі — апантаны герой, які дзеля справы ахвяруе нават сябрамі. Але дзеля чаго ўсе тэхналогіі?..

**Андрэй Расінскі**




# Каманда геніяльнага трэнера

**Віктар Ганчарэнка вывеў БАТЭ ў наступны этап Лігі Еўропы датэрмінова.**

У матчы чацвёртага тура групавога турніра Лігі Еўропы БАТЭ перамог ціраспальскі «Шэрыф» з лікам 3:1. Перамога забяспечыла датэрміновы выхад з групы.

Нягледзячы на не самую прывабную шыльду постсавецкага процістаяння БАТЭ і «Шэрыфа», матч меў каласальнае значэнне як для аднаго боку, так і для іншага. Беларусы маглі датэрмінова, за два туры да фінішу, забяспечыць сабе выхад з групы. А ціраспальцам хацелася даказаць, што пройгрыш двухтыднёвай даўніны быў выпадковасцю.

Надвор'е было футбольным. Як для пачатку лістапада, то ўвогуле шыкоўным. І людзей прыйшло дастаткова. Дзесьці тысяч пятнаццаць.

Аўдыторыя сведчыць, што ў выпадку будаўніцтва 13-тысячніка ў Барысаве, ён на матчах такога рангу будзе забівацца пад завязку.

Перад стадыёнам сустрэў лідара кампаніі «Гавары праўду» Уладзіміра Някляева з кіраўніком свайго штаба Андрэем Дзмітрыевым. Да іх падыходзіў намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў. Потым даведаўся, што за матчам назіралі яшчэ Алесь Міхалевіч і Яраслаў Раманчук. Ну з такімі гледачамі на трыбунах прайграваць нельга :).

Які ў Ціраспалі, БАТЭ зноў удалося хутка забіць. Гэта нядаўні юніёр Зміцер Бага (ягоны старэйшы брат некалі таксама гуляў за БАТЭ), які з прычыны траўмаў некаторых лідараў выйшаў у асноўным складзе, аддаў бліскучую перадачу на Віталя Радзівонава. Нападнік не разгубіўся, адарваўся ад абаронцаў, перайграў варатара і з вострага вугла трапіў дакладна. Абаронцы «Шэрыфа» дагналі мяч, калі ён ужо перасек стужачку.

Забілі гол, і нібыта спалохаліся гэтага. Так часта бывае з беларускімі камандамі. А вось малдаване пайшлі наперад. Адзін раз выратаваў Верамко. Але на 32-ой хвіліне нават наш брамнік быў бяссільны супраць удара галавой Ярохіна — 1:1.

Так першы тайм і скончыўся. У прынцыпе, лічбы былі заслужанымі.

Выглядае, што пераломны момант у сустрэчы адбыўся на 56-й хвіліне, калі траўму атрымаў балгарскі галкіпер «Шэрыфа» Уладзіслаў Стаянаў. У барацьбе з нашым Сяргеем Сасноўскім ён траўмаваў руку. Потым высветліцца, што ў варатара пералом.

На полі з'явіўся малады 19-гадовы дублёр Дзмітры Стажыла. Дзесьці якраз у гэты час над стадыёнам заімжэў дождж. Трава стала слізкай. Адзін далёкі ўдар Стажыла адбіў перад сабой. Гэта нібыта знак — у жыцці трэба біць болей і з розных дыстанцый.

На 70-й хвіліне поспех прыйшоў да барысаўцаў. Радзівонаў пазмагаўся на другім паверсе, пасля чаго мяч адскочыў да Паўлава. Руды ў камандзе — на ўдачу. Паўлаў у чарговы раз гэта пацвердзіў. Ягонаму ўдару Стажыла не даў рады.

А праз пяць хвілін бліскуча рэалізаваў штрафны бразілец Рэнан Брэсан. Эх, так і хочацца, каб хутчэй гэтага хлопца натуралізавалі і далі магчымасць гуляць за беларускую зборную.

На куражы маглі забіць і яшчэ. Але дзеля справядлівасці скажам, што буйной паразы «Шэрыф» не заслугоўваў. Каманда ў Ціраспалі добрая. Проста канкрэтна ў гэты вечар БАТЭ быў мацней.

А з Кіева тым часам прыйшлі не менш прыемныя навіны. Былы беларус Арцём Мілеўскі забіў два галы ў вароты нідэрландскага АЗ. Перамога «Дынама» забяспечыла БАТЭ выхад з групы. Такога ў нас яшчэ не было.

Віктара Ганчарэнку на прэс-канферэнцыі сустракалі апладысментамі. «Мы зрабілі вялікую справу», — сказаў настаўнік. З ім немагчыма было не пагадзіцца. Які ўжо раз даводзіцца прамаўляць: «Брава, БАТЭ!»

**Зміцер Панкавец**

НАШЫ СКРОЗЬ

## Беларускамоўная Windows 7 з'явіцца ў наступным годзе

**Праца над перакладам вядзецца са студзеня.**

Адзін з ініцыятараў перакладу Алесь Булойчык паведаміў, што ўжо зроблена траціна працы. «Мы ідзём ад больш ужывальнага да менш ужывальнага», — тлумачыць Алесь. І адзначае, што пакуль некаторыя праграмы з пакета Windows беларусізаваць не будуць. Па яго словах, поўнага перакладу не мае нават расейскамоўныя версія.

Разам з Алесем над перакладам працуе Усевалад Чорны. Яны запрашаюць іншых людзей далучацца.

Да вясны плануецца зрабіць пераклад амаль усіх паведамленняў, якія бачыць шараговы карыстальнік Windows 7.

Але ўжо цяпер можна скарыстацца першымі вынікамі.

Маладыя людзі ствараюць усталёўнік, які не замяняе англамоўныя ці расейскамоўныя файлы Windows 7, а да існуючых дадае беларускія. Пакунак перакладу распаўсюджваецца бясплатна.

Ніякай падтрымкі ад кампаніі Microsoft, якая выпускае Windows, няма.

Праца Булойчыка і Чорнага — не першая спроба абеларусіць аперацыйную сістэму. Раней рабіліся пераклады папярэдніх версій Windows. Праграміст Алег Азароўскі стварыў асобны сайт, на якім размясціў папулярныя праграмы для Windows на беларускай мове. Але найбольш удалым на сёння з'яўляецца пераклад Linux.

Windows — гэта сямейства аперацыйных сістэм карпарацыі Microsoft. Пад кіраўніцтвам гэтых сістэм працуе каля 90% персанальных камп'ютараў.

**Сяргей Макарэвіч**

ПРА-КОЛЫ

## Беларус паставіў у Эстоніі рэкорд хуткасці

Супрацоўнікі эстонскай паліцыі спынілі чорны Bentley з беларускімі нумарамі, які разагнаўся на загараднай трасе да 241 км/г.

Bentley злавілі ў раёне 22-га кіламетра шашы Талін — Пярну. Кіроўца, 42-гадовы мужчына, прызнаў сваю віну і патлумачыў, што спяшаўся на важную сустрэчу ў іншую краіну.

У дачыненні да парушальніка распачатая справа. Эстонскі закон аб дарожным руху прадугледжвае за перавышэнне дазволенай хуткасці больш, чым на 40 км/г, штраф, арышт або пазбаўленне права на кіраванне тэрмінам да года.

**КаМ**

ТЭЛЕФАНІЯ

## Life:) страціў 300 тысяч абанентаў

Змены адбыліся праз новую методыку падліку абанентаў, уведзеную Turkcell. Раней абанент лічыўся «актыўным», калі папоўніў рахунак на працягу апошніх трынаццаці месяцаў, цяпер гэты перыяд скарочаны да паўгода.

Такім чынам, у беларускага life:) налічваецца 1,2 мільёна кліентаў замест 1,5 мільёна ў папярэднім квартале.

**ЯВ**

СВЕТ РАСЛІН

## Батанічны сад перастаў закрывацца на зіму

Цэнтральны батанічны сад у Мінску зараз будзе адкрыты для наведнікаў цэлы год. Праўда, ад лістапада да сакавіка цэнтральныя вароты і каса з боку плошчы Калініна ўсё ж будуць зачыненыя. Можна купіць квіткі ў фірмовай краме батанічнага саду па адрасе вуліца Сурганава, 2в і прайсці праз службовы ўваход.

Шпацыраваць у Батанічным у апошнія дні восені можна ад 10.00 да 17.00, апроч выхаднага дня — панядзелка.

**«Минск-Новости»**

Сапраўдная беларуская кухня

## Сезон трусоў

### Трус смажаны

500 г мяса труса, 50 г сала або свіной грудзінкі, 1—2 ст. лыжкі смятаны, 1 ст. лыжка сметанковага маргарыну, соль па смаку.

Заднія ножкі труса нашпігаваць свіным салам або свіной вэнджанай грудзінкай, пасаліць, змазаць смятанай, пячы на блясе або ў гусятніцы ў духоўцы да гатоўнасці.

Падаваць можна з мочанымі брусніцамі, смажанай бульбай, брусэльскай капустай, райскімі яблычкамі, скрылікамі лімона, зелянінай.

### Тушаныя трубачкі з мяса труса

1 трус, соль, чорны і чырвоны молаты перац, 200 г варанай каўбасы, 1 крутое яйка, 100 г сыру, 60 г масла або маргарыну, 1,5—2 шклянкі булёну, вострыя прыправы, 1 ст. лыжка мукі, 2—3 ст. лыжкі смятаны, соль, чорны і чырвоны молаты перац, кроп або зяляніна пятрушкі, лісточкі мацярдушкі, маярану, мяты і г.д. да густу.

Труса разрэзаць на вялікія кавалкі (пярэднія ножкі, заднія ножкі, 2—4 часткі тушкі), косці выдаліць. Ва ўтвораныя адтуліны насыпаць солі і перцу і пакласці нарэзаныя саломкай або кубікамі каўбасу, яйка і сыр. Кавалкам прыдаць форму трубачак, перавязаць шпагатам або замацаваць вострымі драўлянымі палачкамі, пакласці ў нізкую каструлю разрэзаным бокам дагары. Наліць булён і пакласці кавалачкі масла, для смаку пакласці лісточкі мацярдушкі, маярану, мяты і г.д. Тушыць пад накрыўкай на слабым агні да поўнай гатоўнасці. Падаць з пасечанай зелянінай кропу або пятрушкі.

**НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ПАДАРОЖЖА**

**Шукаем сяброў для падарожжа** 21 лістапада па маршруце: Лукавец–Стайкі–Мацькаўцы–Альковічы–Старынкі–Абадоўцы–Асцюковічы–Вязынь–Латыгаль. Т.: 262–73–43, (029) 111–73–32.

**ПРАЦА**

**Падпрацоўка для студэнткі або пенсіянеркі,** якая цікавіцца беларускай літаратурай і музыкай. З 15–й да 19–й па буднях. Т.: (029) 615–47–76, (029) 279–47–76.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Пара канькабежцаў прабегла на стадыёне 6 кругоў. Колькі кругоў прабег кожны канькабежац?

2) Бабуля дала палову сваіх яблыкаў унучцы. Калі яна дала ёй яшчэ палавіну яблыка, то ў бабулі застаўся 1 яблык. Колькі ўсіх яблыкаў было ў бабулі першапачаткова?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**



Добраахвотныя памочнікі самадзержца. «Аргкамітэт» па вылучэнні дэлегатаў «Усебеларускага сходу» ад Ленінскага раёна не пусціў на сход Уладзіміра Някляева. Старонка 9.



Камуністы адсвяткавалі Дзень кастрычніцкай рэвалюцыі. Старонка 11.



**Ёй 44, а яна паранейшаму захапляе. Адна з самых вядомых супермадэляў 1990-х гадоў вярнулася да працы. Фота Сіндзі Кроўфард з'явіліся ў шматлікіх часопісах, ад Harper's Bazaar да L'Officiel.**



# Да парома не даскочыў

Каскадзёр з Кобрынскага раёна спрабаваў паспець на пераправу.

Здарэнне, вартае фільмаў Эміра Кустурыцы, адбылося на Дняпроўска-Бугскім канале ў Кобрынскім раёне.

Была другая гадзіна ночы. Паром ужо адыходзіў, але кіроўца Volkswagen Passat спадзяваўся, што такі паспее. Аб'ехаў шлагбаўм, заплюшчыў вочы на знак і... скочыў. Але да парома не даскочыў, бо адлегласць ад берага складала ўжо 10 метраў.

Паромнік спусціў човен і дапамог кіроўцу і пасажыру дабрацца да берага. У машыне, як аказалася, сядзелі дзядзька і пляменнік. Дзядзька жыве ў Берасці.

У ягонай крыві знайшлі алкаголь.

А вось Volkswagen Passat пацвердзіў сваю рэпутацыю машыны, якую не ўб'еш. Пажарнікі дасталі яе з вады, і аказалася, што ў яе, гаворачы мовай міліцэйскага пратакола, «нязначныя механічныя пашкоджанні».

**Сяргей Гезгала**

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

## Анекдоты

Бізнэсоўца пытаюцца, як ён стаў мільянерам.

— Дзякуючы жонцы.

— ?!!

— Мне было цікава, на якім этапе яна перастане наракаць, што мала грошай.

* * *

— У вас ёсць рэкамендацыі з ранейшага месца працы?

— Так, мне там парэкамендавалі пашукаць іншую працу.

* * *

Бабуля Майка Тайсана клала ўнука спаць з двух удараў.

* * *

— Брытва «Жылет»: з раніцы пагаліўся і да вечара парадак.

— Станок «Спутнік»: пагаліўся, і шчэць месяц не расце. Баіцца!

## «НН» сто гадоў з вамі

**Лынтупы.** Калі арганізоўвалі пажарную каманду, адзін з членаўарганізатараў абяцаўся 240 руб. на пажарную машыну і на другія пажарныя прылады 100 руб. За гэтыя абяцанкі пан напярод атрымаў падзяку «Віл. вестніка», але абяцанка абяцанкай і засталася.

**Ад Рэдакцыі.** Гэта апошняя карэспандэнцыя нашага супрацоўніка з Лынтуп. 19/X атрымалі мы аб ім такую вестку: «17 гэтага месяца (у нядзелю) прабілі нажом Е.Я. (Лынтупскага), карэспандэнта «НН», каторы не пераҗыў ночы і памёр. Не любілі яго злыдні як карэспандэнта, каторы сумленна асвячаў усю блаж нашага кута».

**«НН». №44–45. 1910**

**Фільм пра Завадскага**

8 лістапада ў сераду ў 22.10 на канале ОРТ пакажуць фільм Паўла Шарамета «Дзікае паляванне». Шарамет спрабуе разабрацца ў таямніцы знікнення аператара Змітра Завадскага.

**«НН». №45. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**
1) 6 кругоў; 2) 3.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 09.11.2010.
Замова № 5459.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614